

ХТО НЕ ЛАСЫ НА МОТАЛЬСКІЯ КАЎБАСЫ **5**

ЧЫМ ЗАПОМНІЛІСЯ ІІ ГУЛЬНІ КРАІН СНД **12**


Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 ЖНІЎНЯ 2023 г. АЎТОРАК № 156 (30036)


## КОРАТКА

- **Беларусь стала лідарам па росце прамвытворчасці ў ЕАЭС.**
- Аранжавы ўзровень небяспекі з-за спякоты аб'яўлены ў Беларусі 15—17 жніўня.
- **У Маскве прайшла сустрэча міністра абароны Беларусі Віктара Хрэніна з міністрам абароны Расіі Сяргеем Шайгу. Кіраўнікі ваенных ведамстваў абмеркавалі пытанні ваеннага супрацоўніцтва.**
- Маштабныя школьныя кірмашы пройдуць 19 жніўня ў Мінскай вобласці.
- **У Беларусі ў І паўгоддзі газіфікавана 17 населеных пунктаў.**
- МАЗ паставіў першую партыю прыгарадных аўтобусаў для Уладзівастока.
- **Сродкі па праграме «Сямейны капітал» датэрмінова выкарыстоўвалі больш за 73 тыс. заяўнікаў.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ШВАЮНОЎ, намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Мінбудархітэктуры сумесна з аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам прымае меры па недапушчэнні перавышэння кошту будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай узроўню сярэдняй заработнай платы па рэспубліцы. За апошнія гады рост сярэднямесячнай заработнай платы апярэджвае сярэдні кошт квадратнага метра, пабудаванага з дзяржпадтрымкай, што ўказвае на павелічэнне ў бягучай пяцігодцы даступнасці жылля з дзяржпадтрымкай для грамадзян, якія стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў».*


ISSN 1990 — 763X


З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Галоўнае, каб мы атрымалі ўраджай»

### Азнаёміўшыся з новай тэхналогіяй апрацоўкі глебы, Прэзідэнт даручыў за год вызначыцца з яе прымяненнем па ўсёй краіне

**Калі на мінулым тыдні Аляксандр Лукашэнка інспектаваў заходнія рэгіёны краіны, то ў полі зроку на мінулых выхадных былі ўсходнія вобласці. І ў гэтым выпадку ў полі — у прамым сэнсе слова. Кіраўнік дзяржавы наведаў сялянскую фермерскую гаспадарку «Старт ТС» у Аршанскім раёне, дзе на прыкладзе аднаго з палёў пaглядзеў тэхналогію безадвальнай апрацоўкі глебы. Гэта пытанне Прэзідэнт абазначыў як стратэгічнае і даў даручэнне на практыцы вывучыць вопыт, каб у наступным годзе зрабіць канчатковыя высновы.**



Фота БелТА.

### Эканоміцца тэхнічны і паліўны рэсурс

Апрацоўка глебы ажыццяўляецца спецыяльным агрэгатам, які адразу па ржышчы пасля ўборкі ўраджаю сее на патрэбную глыбіню, уносіць угнаенні. Прэзідэнт пацікавіўся, ці не будзе з такой тэхналогіяй шмат пустазелля — пасля жніва застаецца шмат травы, якая не заворваецца, як звычайна.

«Віцэ-прэм'ер Леанід Заяц растлумачыў, што будуць прыменены спецыяльныя сродкі, каб заглушыць рост непатрэбнай травы і пустазелля. Ён далажыў, што ў адной з гаспадарак з пасеваў па такой тэхналогіі ўжо атрымалі высокі ўраджай рапсу, пшаніцы, добра ўрадзіла і кукуруза.


СТАР. 2


Размова па сутнасці

**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:**

# «Электаральная кампанія, якая мае адбыцца, — чарговая праверка на трываласць беларускага грамадства»



**Літаральна праз некалькі тыдняў у Беларусі стартуе выбарчая кампанія. Яна ў палітычнай гісторыі краіны будзе вызначальнай: упершыню, згодна з новай рэдакцыяй Канстытуцыі, у лютым наступнага года мы будзем адначасова, у адзіны дзень галасавання, выбіраць дэпутатаў усіх узроўняў. Пасля ў хуткім часе, таксама на новых умовах, будуць выбраныя дэлегаты Усебеларускага народнага сходу, які цяпер Асноўным Законам надзелены найвышэйшымі паўнамоцтвамі. Гэтаму папярэднічала вялікая работа абедзвюх палат беларускага парламента — заканадаўчую базу краіны трэба было прывесці ў адпаведнасць з новай рэдакцыяй Канстытуцыі. Аб выніках гэтай карпатлівай адказнай работы, аб найбліжэйшых выбарах, аб працэсах, якія адбываюцца ў грамадска-палітычным жыцці краіны, мы пагутарылі са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімірам АНДРЭЙЧАНКАМ.**


СТАР. 3


Па палічках

# Маёмасныя падаткі: заплаці і спі спакойна

### Як зрабіць гэта своечасова і без парушэнняў

**Беларусам да 15 лістапада трэба заплаціць тры віды маёмасных падаткаў — транспартны, зямельны і на нерухомасць. Каму неабходна ўнесці ў бюджэт названыя плацяжы? Якія льготы прадугледжаны для грамадзян? Якія спосабы выплаты прапануюцца плацельшчыкам? На гэтыя актуальныя пытанні падаткаабкладання зямельных участкаў, нерухомасці і транспартнага падатку падчас прэс-канферэнцыі адказаў начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Андрэй КАВАЛЕЎСКІ.**




СТАР. 4

# «У НАС АДЗІНАЯ АЙЧЫНА, І Ў ІМЯ ГЭТАГА МЫ ПАВІННЫ ПРАЦАВАЦЬ»

**Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу з расійскім палітыкам і дзяржаўным дзеячам Дзмітрыем Рагозіным**

**Прэзідэнт заўважыў, што рады сустрэцца і абмеркаваць увесь комплекс пытанняў, які назапасіўся за гэты час. «Ведаю вас як чалавека дзейнага, які не можа быць дзесьці ўбаку ад галоўных падзей не толькі ў рэгіёне, але і ў свеце, — адзначыў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да Дзмітрыя Рагозіна. — Гатовы садзейнічаць таму, каб вашы вопыт і веды спатрэбіліся на карысць нашым агульным ідэям, якія мы разам з вамі падзяляем, і прытым даўно. У нас адзіная Айчына, і ў імя гэтага мы з вамі проста павінны працаваць».**

Па словах Прэзідэнта, для рэалізацыі агульных ідэй ёсць гатоўнасць выкарыстаць увесь навукова-практычны патэнцыял Беларусі. «Калі гэта будзе выгадна для нас, вас і ў цэлым для нашага адзінства — Беларусі і Расіі», — удакладніў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу, Дзмітрый Рагозін выказаў удзячнасць беларускаму лідару за магчымасць сустрэцца і абмеркаваць актуальныя пытанні. Ён паведаміў, што знаходзіцца ў Мінску ў межах рабочай паездкі, падчас якой запланаваны сустрэчы з прадстаўнікамі беларускай прамысловасці. «З маімі старымі сябрамі, з якімі мы ніколі не гублялі нашы добрыя адносіны, — канкрэтызаваў ён. — Буду весці перагаворы па шэрагу праектаў, якія звязаны перш за ўсё з дзейнасцю нашага навукова-тэхнічнага цэнтра».

Дзмітрый Рагозін перакананы, што гэта будуць цікавыя рэчы, і адказаў на пытанне кіраўніка дзяржавы аб тым, што ён «знік з радараў»: «Як працаваў, так і працую. У другой якасці, але са значна большым патэнцыялам магчымасцяў і ўлікам тых каласальных перамен, якія адбываюцца ў галіне і свеце тэхналогій». У тым ліку аб гэтым госць Палаца Незалежнасці расказаў беларускаму лідару.

**Вераніка КАНЮТА.**

# «Галоўнае, каб мы атрымалі ўраджай»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

«Нам бы не прамахнуцца. Галоўнае, каб мы атрымалі ўраджай. Я думаю, што першы год трэба паспрабаваць. Палавіну так пасеяць, а палавіну пры звычайным ворыве, — звярнуўся Прэзідэнт да кіраўніцтва гаспадаркі. — Будзем спрабаваць тут. У добрых гаспадарках — там, дзе ўжо вопыт ёсць, безадвальная апрацоўка глебы і сяўба па ржышчы — гэта добры варыянт. Але трэба асабліва па поўначы, усходзе акуратна да гэтага падыходзіць».


Фота БелТА

«Я думаю, што гэта ланцуговая рэакцыя. Калі паспяховыя прадпрыемствы прымянілі ўжо гэту тэхналогію і ў іх ідзе эканомія і аб'ём вытворчасці прадукцыі, то пойдуць і ўсе», — выказаў меркаванне віцэ-прэм'ер.

Аляксандру Лукашэнку таксама далажылі, што пры такой тэхналогіі не толькі эканоміцца тэхнічны і паліўны рэсурсы — гэта добра і пры засухах. Пласт зямлі не пераварочваецца, адпаведна лепш захоўваецца вільгаць. Яшчэ адзін плюс — захаванне карысных бактэрый і дажджавых чарвякоў.

### Трэба вывучыць плюсы і мінусы

Але Прэзідэнт усё ж настойвае на тым, каб да такой навацыі падыходзілі ўзважана, папярэдне вывучыўшы ўсе магчымыя плюсы і мінусы. Усё ж такі калі поле заворваецца традыцыйным спосабам, пласт зямлі пераварочваецца, унізе ўсё перагнівае, глеба атрымлівае натуральнае ўгнаенне. Тут жа ўраджайнасць падтрымліваецца пераважна за кошт комплексу ўгнаенняў.

«Думаю, што нейкую частку плошчаў тваіх пасяўных трэба пакінуць і араць з пераварочваннем пласта. І параўноўвай. Асабліва ў наступным годзе — што будзе тут, што будзе з пераварочваннем пласта. А потым, калі ўсё нармальна пойдзе, будзем паступова пераходзіць не толькі тут, але і па краіне на гэтыя тэхналогіі. Людзі пойдуць. Былі б агрэгаты гэтыя», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт расказаў, што і сам у гады кіраўніцтва сельгаспрадпрыемствам вывучаў такі вопыт і спрабаваў гэту тэхналогію апрацоўкі глебы. «Але параіць, падказаць не было каму. Тэхналогіі не ведалі. Ну, безадвальная і безадвальная... Добра безадвальная там, дзе пустазелля няма. А ў нас тут мора пустазелля і надвор'е такое. І я слаба апрацаваў палі супраць пустазелля. Таму вам трэба мець на ўвазе тут, што пустазелле трэба знішчаць. Ну і два-тры разы глебу трэба падкарміць», — адзначыў ён.

Але і тут спецыялісты настойваюць, што праз парутройку гадоў праблема знікне практычна сама сабой. Калі не пераварочваць пласт зямлі, то закапанае глыбока насенне пустазелля не трапляе наверх і не мае магчымасці прарасці. А пры належнай рэгулярнай апрацоўцы хімсродкамі верхняга пласта маштабы «пустазельнай праблемы» паступова будуць змяншацца і поле будзе чыстым.

«Увогуле, гэтай тэхналогіі быць. У наступным годзе мы зробім канчатковыя высновы. Менавіта тут», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

### «Гэта стратэгічныя пытанні»

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што якраз і прыязджае туды, дзе можна вывучыць і ўзяць штосьці новае, на перспектыву. «Гэта адна з перспектыў. Калі ласка, прапануйце новыя тэхналогіі — прыедзем, будзем глядзець. Таму гэта наша перспектыва і стратэгія», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што калі гэты вопыт сябе апраўдае, то трэба ісці шляхам такой аптымізацыі. Паколькі гэта тэхналогія дае магчымасць у разы сэканоміць паліва і тэхнічныя рэсурсы. Адпаведна, пад тыя ж аб'ёмы работ патрабуецца менш работнікаў. «Людзей (у гаспадарках. — «**Зв.**») больш не будзе. І не трэба. Нам трэба гэтых пакінуць і заплаціць добра. Таму вось гэта стратэгія наша. Трэба паглядзець па вобласці, дзе як пойдзе. Усюды трэба паспрабаваць, і нават на самай крайняй поўначы (у Віцебскай вобласці. — «**Зв.**»). Трэба паспрабаваць, што ў нас атрымаецца, але акуратна», — заявіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што аналагічным чынам выбудоўваюць стратэгію і па іншых кірунках у развіцці сельскай гаспадаркі. Напрыклад, у жывёлагадоўлі, дзе прынята рашэнне аб пераводзе ў найбліжэйшыя гады ўсяго статка БРЖ у сучасныя комплексы. «Даіць трэба ў комплексах, а не на гэтых дзікіх фермах. Не гаворачы пра цялят ужо. Гэта стратэгія ў жывёлагадоўлі. Тое ж самае па адкорме. Птушкагадоўля, свінагадоўля — тут зразумела. Мы даўно разумеем, што гэта комплексы. Але гэта стратэгічныя пытанні», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Нядаўна Прэзідэнт у Гродзенскай вобласці наведваў буйны комплекс па адкорме і ўтрыманні БРЖ. Падзяжу жывёлы ў гэтай арганізацыі практычна няма, і менавіта ў такія месцы кіраўнік дзяржавы арыентуе перадаваць цялят з адстаючых гаспадарак. «Калі ў гаспадарцы з'явіліся цяляты і яны не могуць іх захаваць, забяры імем рэвалюцыі і аддай на комплекс. Але ён заплаціць. Гэта для беднай гаспадаркі грошы і выхад са становішча. Таму жалезная павінна быць дысцыпліна. Пра падзеж размовы быць не можа. Выкарыстоўвайце любыя драконаўскія метады», — арыентуе кіраўнік дзяржавы кіраўніцтва абласцей і раёнаў.

Аляксандр Лукашэнка ў ходзе рабочай паездкі даў і шэраг тактычных даручэнняў, якія датычацца цяперашняй уборачнай кампаніі. Адно з іх — наконт кукурузы. Трэба ўжо цяпер падрыхтавацца да ўборкі гэтай культуры, дакладна вызначыўшы, што нарыхтоўваць на сілас, а што на зерне, падрыхтаваць тэхніку.

Яшчэ адна задача — аператыўна вызваліць палі, убраць салому, правесці сяўбу азімых культур. «Калі зацягнеш у кастрычнік сяўбу, як у нас была у Віцебскай вобласці, тое і атрымаеш у наступным годзе», — заўважыў Прэзідэнт.

Нагадаў ён і пра перакідванне камбайнаў, дзе неабходна дапамагчы з уборкай: «Абавязкова трэба рухацца на поўнач. Калі трэба дзесьці, неабходна перакідаць».

Адначасова стаіць задача па нарыхтоўцы травяністых кармоў. Пасля дажджоў травы пайшлі ў рост, і ўсе работы ў сельскай гаспадарцы сышліся на часе.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

Партнёрства

# Развіваць патэнцыял

**У Гродне прайшло IV пасяджэнне рабочай групы па супрацоўніцтве паміж Беларуссю і Томскай вобласцю**

**Падчас сустрэчы падпісана дарожная карта па развіцці гандлёва-эканамічных, навукова-тэхнічных і культурных адносін. Дзейсным інструментам развіцця двухбаковых адносін стала падпісанне пагаднення паміж урадам Беларусі і Адміністрацыяй Томскай вобласці ў 2016 годзе.**

Чарговае пасяджэнне рабочай групы па супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Томскай вобласцю Расійскай Федэрацыі адбылося пад кіраўніцтвам міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэя Худыка і губернатара Томскай вобласці Уладзіміра Мазура. У рабоце прыняў удзел старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік. Былі падведзены вынікі работы па значным спектры міждзяржаўных адносін за тры папярэднія гады і вызначаны планы на 2024—2026 гады.

Пытанні, якія ўзняты падчас пасяджэння рабочай групы беларускага і расійскага бакоў, датычылі прамысловасці, сельскай гаспадаркі, навукі і адукацыі.

Як зазначыў Андрэй Худык, за тры гады супрацоўніцтва склалася шырокая наменклатура тавараў, якія паспяхова пастаўляюцца і рэалізоўваюцца ў расійскім рэгіёне і Беларусі. Рост прамысловых тавараў звязаны яшчэ і з тым, што дзяржавы ставяць на першае месца вырашэнне задач тэхналагічнага супрацоўніцтва. Напрыклад, беларускія машынабудаўнічыя прадпрыемствы паспяхова рэалізоўваюць антысанкцыйныя праекты, якія дазваляюць нарошчваць выпуск тэхнікі і пазбягаць заходніх камплектуючых агрэгатаў.

Вядзецца работа па пастаўцы ў Томскую вобласць сучасных беларускіх трактароў, камбайнаў, сельскагаспадарчай, лесанарыхтоўчай і іншых відаў тэхнікі. Агульныя праекты датычаць работы камунальнай гаспадаркі, перапрацоўкі другаснай сыравіны, здабычы карысных выкапняў і іншага. Губернатар Томскай вобласці Уладзімір Мазур звярнуў увагу на неабходнасць развіцця навукова-тэхналагічнай сферы і інфармацыйных тэхналогій у прамысловасці. Прыклады такога супрацоўніцтва ўжо ёсць у машынабудаўнічай галіне, дзе з беларускага боку задзейнічана прадпрыемства БелАЗ.

Згодна з дарожнай картай, на 2024—2026 гады распрацаваны шэраг мерапрыемстваў, у якіх з беларускага боку будзе задзейнічана гандлёва-прамысловая палата, галіновыя міністэрствы, вядучыя прадпрыемствы краіны, Нацыянальная акадэмія навук, ВНУ, абласныя і гарадскія выканаўчыя камітэты, іншыя ўстановы. Мерапрыемствы па рэалізацыі дарожнай карты фінансуюцца ў рамках двухбаковага пагаднення.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Надвор'е

# СПЯКОТА І КАРОТКАЧАСОВЫЯ ДАЖДЖЫ

**Спякотнае надвор'е ўсталюецца ў Беларусі, але прагназуюцца ападкі. Пра гэта паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

«Ужо 15 жніўня, паветраныя патокі ў атмасферы прымуць паўднёва-заходні напрамак, і на тэрыторыю краіны накіруюцца вельмі цёплыя паветраныя масы трапічнага паходжання. У Беларусі ўсталюецца спякотнае надвор'е з тэмпературным фонам у асноўным на 3—9 градусаў вышэй за норму. Не прынясуць значнага палягчэння і ночы, бо слупкі тэрмометраў будуць знаходзіцца ў межах ад 12 да 24 градусаў», — расказалі сіноптыкі.

Згодна з папярэднім прагнозам, дыхаць стане лягчэй толькі напрыканцы тыдня, калі дзённая тэмпература паветра панізіцца да камфортных значэнняў, толькі ў паўднёва-заходніх раёнах слупкі тэрмометраў яшчэ будуць перавышаць 30-градусныя адзнакі. «Разам з тым паветраная маса, якая паступае ў Беларусь, няўстойлівая, насычана вільгаццю, а гэта значыць, што на працягу тыдня не выключаны лакальныя навальнічныя дажджы», — адзначылі ў Белгідрамеце.

У сераду, 16 жніўня, пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах Віцебскай вобласці пройдуць невялікія дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 12 градусаў па ўсходзе да 21 па захадзе. Днём будзе 27—34 градусы.

У чацвер, 17 жніўня, у асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 14 па ўсходзе да 22 па захадзе. Днём будзе 27—34 градусы.

У пятніцу, 18 жніўня, месцамі па краіне чакаюцца дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 14—21. Днём будзе 26—33 градусы спякоты, у паўночных раёнах плюс 24—25.

У суботу, 19 жніўня, месцамі па краіне прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 13—20 градусаў. Днём будзе ад 24 па паўночным усходзе да 33 па паўднёвым захадзе.

У нядзелю, 20 жніўня, месцамі па краіне чакаюцца дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 10 у паўночна-ўсходніх раёнах да 20 градусаў у паўднёва-заходніх. Днём будзе 22—29, пераважна па паўднёва-заходняй палове краіны 30—33 градусы.

# «Электаральная кампанія, якая мае адбыцца, — чарговая праверка на трываласць беларускага грамадства»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

***— Уладзімір Паўлавіч, гэты год быў надзвычай важны для дэпутацкага корпуса — і па аб'ёме праведзенай работы, і па адказнасці, — фактычна заканадаўча змянілася электаральная сістэма дзяржавы. Цяпер, калі выбарчая кампанія ўжо рыхтуецца да старту, можна, падводзячы вынікі, сказаць, што пастаўленыя задачы Палата прадстаўнікоў выканала?***

— Што гэты год будзе асаблівым, у сваім выступленні ў пачатку 2023-га адзначаў Прэзідэнт нашай краіны. «Асаблівым ён будзе ў тым ліку ў плане падрыхтоўкі да найважнейшых палітычных падзей — электаральнай кампаніі. У 2024 годзе ў нас пройдуць адначасова выбары ў парламент і мясцовыя Саветы дэпутатаў. І ўпершыню фактычна ў новым фармаце выбары дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. Усе гэтыя працэсы будуць праходзіць практычна адначасова. Гэта вялікі, вядома ж, аб'ём арганізацыйнай работы, падрыхтоўчай», — так ён настройваў усіх, у тым ліку і дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў.

Менавіта гэтай, незаўважнай падрыхтоўчай рабоце і была прысвечана істотная частка дзейнасці Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі ў 2023 годзе. Перапрацоўка заканадаўства ў адпаведнасці з палажэннямі абноўленай Канстытуцыі краіны, унясенне дапаўненняў і змяненняў у асноўныя прававыя акты — гэта найважнейшыя этапы работы парламентарыяў.

Да гонару дэпутатаў, асноўны аб'ём работ быў выкананы своечасова, а ўжо 16 лютага гэтага года Прэзідэнт падпісаў абноўлены Выбарчы кодэкс краіны.

Згодна з планамі, карэкціроўка нацыянальнага заканадаўства ў адпаведнасці з палажэннямі абноўленай Канстытуцыі павінна была быць завершана да 15 сакавіка 2024 года, аднак у частцы, якая датычыцца выбарчых норм і механізмаў, работа практычна выканана. Праведзена тытанічная праца, вынікі якой рэалізаваны ў дзясятках заканадаўчых актаў, якія раскрываюць асаблівасці нацыянальнай мадэлі развіцця. У дзяржаве ўдакладнена выбарчае заканадаўства, створана аснова для дэмакратычнага развіцця, забеспячэння суверэнітэту краіны і адстойвання нацыянальных інтарэсаў у палітычнай сферы.

***— Якія вызначальныя змяненні былі ўнесены ў выбарчае заканадаўства?***

— Хачу адзначыць, што паралельна вялася распрацоўка новых законаў «Аб асновах грамадзянскай супольнасці», «Аб Усебеларускім народным сходзе», уносіліся змены ў законы «Аб нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь», «Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь», «Аб палітычных партыях», «Аб грамадскіх аб'яднаннях».

У новай рэдакцыі Выбарчага кодэкса аптымізаваны парадак стварэння выбарчых акруг, фарміравання ЦВК і сістэмы выбарчых камісій, замацавана норма аб недапушчальнасці замежнага грамадзянства (ільгот) у кандыдатаў у дэпутаты, выключаны парог яўкі выбаршчыкаў на выбарах у Палату прадстаўнікоў, удакладнены парадак датэрміновага галасавання і выкарыстання фота- і відэаасродкаў. Найважнейшай навацыяй заканадаўчага акта з'яўляецца забарона «на фінансаванне расходаў на падрыхтоўку і правядзенне выбараў замежнымі дзяржавамі, арганізацыямі, грамадзянамі», што накіравана на ўстараненне перадумоў знешняга маніпулявання выбарчым працэсам.

***— У сённяшняй сітуацыі, калі практычна на ўсе сферы нашага жыцця спрабуюць аказаць знешні ціск, гэта сапраўды вельмі важная навацыя...***

— Увогуле, сёння мэтазгодна больш пільную ўвагу ўдзяляць забеспячэнню электаральнага суверэнітэту дзяржавы. Мы не павінны апраўдвацца ні перад «міжнароднай» супольнасцю, ні перад праваабарончымі арганізацыямі. Нам трэба дзейнічаць выключна ў рамках нацыянальнага заканадаўства, праводзіць выбары па ўстаноўленых у краіне правілах і ў інтарэсах беларускага народа.

Апошнім часам міжнародныя палітычныя інстытуты нярэдка ператвараюцца ў прылады эскалацыі і прасоўвання ўласных інтарэсаў. Большасць з іх даўно не незалежныя і дэмакратычныя. Сама дэмакратыя, у заходняй інтэрпрэтацыі, страціла сваю сутнасць як уладу народа, ператварылася ў аўтакратыю, якая абараняе права рабаваць іншых.

Неад'емнае права суверэннай дзяржавы — самастойна, без умяшання і ўказанняў звонку праводзіць электаральныя кампаніі, а грамадства — рабіць усвядомлены, дэмакратычны выбар. У гэтым і заключаецца народаўладдзе, якое складае аснову беларускай дзяржаўнасці. Але заходнія краіны ўжо не адно дзесяцігоддзе не прызнаюць вынікі нашых выбараў — ні прэзідэнцкіх, ні парламенцкіх. Беларусаў увесь час спрабуюць вучыць дэмакратыі, абвінавачваюць у парушэнні выбарчага заканадаўства і адсутнасці «свабоды», у пасіўнасці і апалітычнасці. Сам выбарчы працэс выкарыстоўваецца як сродак умяшання ва ўнутраныя справы краіны, змены існуючай палітычнай сістэмы і вектараў развіцця. Для гэтага задзейнічаюцца напрацоўкі ў сферы тэорыі і практыкі «каляровых рэвалюцый», актыўна эксплуатуюцца праблемы ў нацыянальных заканадаўствах і распальваюцца ўнутраныя супярэчнасці...

Мы не можам на гэта не рэагаваць, у тым ліку і на заканадаўчым узроўні. Беларусь адкрыта для канструктыўнага, раўнапраўнага дыялогу, але не пацерпіць дыктату і фанабэрыі ў адносінах да сябе, не будзе ўспрымаць павучанняў і ментарскага тону ні ад кога. У нашай Канстытуцыі замацавана, што «адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў краіне з'яўляецца народ». Гэта найважнейшы прынцып нацыянальнага народаўладдзя і аснова незалежнага развіцця, якія рэалізоўваюцца праз электаральны суверэнітэт.

***— Заканадаўчыя змяненні, датычныя партыйнага будаўніцтва ў краіне, прынятыя таксама дзеля ўмацавання гэтага суверэнітэту?***

— Цяпер у краіне завяршаецца рэфармаванне айчыннай партыйнай сістэмы, а палітычныя партыі праходзяць працэдуру перарэгістрацыі. Сёння сваю самавітасць пацвердзілі камуністычная і ліберальна-дэмакратычная партыі, рэспубліканская партыя працы і справядлівасці, а таксама «Белая Русь». Усе яны выступаюць за канструктыўнае развіццё краіны і садзейнічаюць рэалізацыі і абароне правоў, свабод, інтарэсаў чалавека і грамадзяніна. Сама палітычная барацьба набывае канструктыўны выгляд і прымяняе адэкватныя спосабы адстойвання інтарэсаў розных слаёў грамадства.

Істотна ўдасканалена ў гэтым плане нацыянальная выбарчая сістэма. У абноўленай Канстытуцыі замацавана права вылучэння кандыдатаў у дэпутаты за палітычнымі партыямі, што пашырае іх магчымасці па ўплыве на працэсы, якія адбываюцца ў краіне.

У рамках нацыянальнага партыйнага будаўніцтва ўлічваецца і творча выкарыстоўваецца міжнародны досвед дзейнасці ў гэтай галіне. Гісторыя сведчыць, што эксперыменты ў палітычнай сферы, як правіла, прыводзяць да трагічных наступстваў. Невыпадкова артыкул 5 Асноўнага Закона краіны «забараняе стварэнне і дзейнасць палітычных партый, а таксама і іншых грамадскіх аб'яднанняў, якія маюць на мэце гвалтоўнае змяненне канстытуцыйнага ладу або вядуць прапаганду вайны, сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасці».

Гэта погляд у будучыню і рэалізацыя на практыцы прынцыпаў талерантнасці і нацыянальнага адзінства. Кожны, хто гатовы працаваць на развіццё і росквіт краіны, можа ўвасобіць свае ідэі ў жыццё праз абноўленую партыйную сістэму і актыўную грамадзянскую пазіцыю. Для гэтага створаны неабходныя ўмовы, а стваральная ініцыятыва толькі вітаецца.

***— Чым, на ваш погляд, павінны кіравацца грамадзяне Беларусі, якія прыйдуць на першыя ў гісторыі краіны выбары па новых правілах?***

— Я зноў працытую тут нашага Прэзідэнта: «Адна з найважнейшых умоў суверэнітэту і незалежнасці — народнае адзінства. Мы, беларусы, заўсёды дэманстравалі яго ў пераломныя моманты гісторыі. Менавіта адзінства давала нам сілы для перамогі над ворагамі і абставінамі».

Наша задача — гэтае адзінства і сваю краіну захаваць. Сёння Беларусь з'яўляецца астраўком стабільнасці і духоўнасці, прыкладам сапраўды дэмакратычнай і палітычна справядлівай дзяржавы. Мы разумеем, што гэта многіх не задавальняе за межамі краіны, а спробы «звярнуць нас на шлях ісціны» будуць працягвацца. У сувязі з гэтым электаральная кампанія, якая мае адбыцца, — чарговая праверка на трываласць беларускага грамадства.

Не выклікае сумневу, што ў структуры выбарнай улады павінны прыйсці прафесіяналы з жыццёвым вопытам, якія займаюць актыўную жыццёвую пазіцыю, гатовыя да стварэння. Найважнейшымі крытэрыямі для народных абраннікаў трэба вызначыць: патрыятызм, гатоўнасць жыць клопатамі людзей і адстойваць інтарэсы краіны. Менавіта яны дазволяць захаваць базавыя асновы развіцця беларускай дзяржаўнасці — сумленнасць і сацыяльную справядлівасць.

Улада на працягу дзесяцігоддзяў выконвае ўсе ўзятыя на сябе абавязацельствы, дзейнічае ў інтарэсах народа, а найбольш важныя пытанні выносіць на ўсеагульнае абмеркаванне. Гэта і ёсць сутнасць сапраўднай дэмакратыі, адзінства народа і ўлады, якое дае магчымасць пераадольваць усе перашкоды, паспяхова процідзейнічаць эканамічнаму і інфармацыйнаму ціску, забяспечваць захаванасць нацыянальнай самабытнасці і культуры, ствараць умовы для развіцця і працвітання дзяржавы і яе грамадзян.

Наша будучыня — у нашых руках. Мы ствараем яе разам, жывучы ўласным розумам і разлічваючы на ўласныя сілы, захоўваючы і прымнажаючы спадчыну продкаў, прытрымліваючыся традыцый і агульначалавечых прынцыпаў, ствараючы і робячы свой дом лепшым.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прадстаўнікі АДКБ і ААН абмяняліся думкамі па сітуацыі ў галіне бяспекі



Намеснік генеральнага сакратара АДКБ Самат Ардабаеў 14 жніўня сустрэўся ў Маскве з памочнікам генеральнага сакратара ААН па справах Еўропы, Цэнтральнай Азіі і Амерыкі Міраславам Енчам, паведамляе афіцыйны сайт АДКБ.

«Бакі абмеркавалі шырокае кола пытанняў супрацоўніцтва паміж ААН і АДКБ, што паступальна развіваецца на аснове палажэнняў прынятай у лістападзе 2022 года чарговай рэзалюцыі Генеральнай асамблеі ААН. З задавальненнем адзначаны актыўны ўдзел Сакратарыята АДКБ у міжнароднай дыскусіі па «Новым парадку для свету» — абмеркаванні ініцыятывы генеральнага сакратара ААН Антоніу Гутэрыша напярэдадні запланаванага ім на верасень 2024 года «Саміту тысячагоддзя», — сказана ў паведамленні.

Намеснік генеральнага сакратара АДКБ і памочнік генеральнага сакратара ААН правялі грунтоўны абмен думкамі па сітуацыі ў галіне бяспекі, якая складваецца ў розных зонах адказнасці АДКБ. «Міраславу Енчу была таксама прадстаўлена інфармацыя аб сістэмнай рабоце, якая праводзіцца ў АДКБ, па ўбудаванні калектыўнага міратворчага патэнцыялу ў дзейнасць ААН», — падкрэслена на сайце Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

«Бакі выказалі гатоўнасць да далейшых плённых кантактаў, у тым ліку ў ходзе маючага адбыцца тыдня высокага ўзроўню на палях 78-й сесіі Генеральнай асамблеі ААН. Пацверджаны намеры працягваць плённае супрацоўніцтва», — дабаўлена ў паведамленні.

### Прэм'ер Латвіі аб'явіў аб сыходзе ў адстаўку



Кіраўнік урада Латвіі Крыш'яніс Карыньш аб'явіў аб сыходзе ў адстаўку, паведамляе ТАСС са спасылкай на латвійскія СМІ.

На прэс-канферэнцыі 14 жніўня Крыш'яніс Карыньш паведаміў, што падасць прашэнне аб адстаўцы прэзідэнту Латвіі Эдгарсу Рынкевічсу. Ён таксама заклікаў партыю «Новае Адзінства» вылучыць новага кандыдата на пасаду прэм'ер-міністра.

Прэм'ер падкрэсліў, што калі ў цяперашнім урадзе «не атрымліваецца знайсці згоду», то неабходна сфарміраваць новы ўрад.

Паводле яго слоў, для развіцця Латвіі неабходны моцны і дынамічны ўрад, які здольны прымаць складаныя рашэнні. Крыш'яніс Карыньш адзначыў, што «Аб'яднаны спіс» і Нацаб'яднанне робяць усё для таго, каб затармазіць спробы наладзіць больш дынамічную работу ва ўрадзе.

### Выбух прагрымеў каля мячэці на ўсходзе Афганістана



Моцны выбух прагрымеў каля мячэці ў афганскай правінцыі Хост, паведамляе БелТА са спасылкай на тэлеканал ToloNews.

Паводле даных прадстаўнікоў мясцовай адміністрацыі, у выніку загінулі тры чалавекі. Удакладняецца, што ахвярамі выбуху сталі ўраджэнцы пакістанскай правінцыі Вазірыстан. Таксама на дадзены момант вядома аб сямі пацярпелых, яны былі дастаўлены ў лякарню.

На месцы працуюць прадстаўнікі сілавых структур. Улады пачалі расследаванне трагедыі.

# Маёмасныя падаткі: заплаці і спі спакойна

## Плацельшчыкам усё паведамяць

Многія, мабыць, ужо атрымалі такія апавяшчэнні: падатковыя органы пачалі накіроўваць фізічным асобам паведамленні аб выплаце маёмасных падаткаў — транспартнага, зямельнага і на нерухомую маёмасць. У іх адлюстравана дэталёвая інфармацыя аб аб'ектах падаткаабкладання, ільготах, разліку падаткаў і сумах, якія падлягаюць да выплаты. Паведамленне павінна быць дастаўлена плацельшчыкам не пазней за 1 верасня, а заплаціць падаткі неабходна да 15 лістапада.

«Падатковымі органамі ўжо вызначана 3,5 мільёна ўнікальных плацельшчыкаў, якім у гэтым годзе неабходна заплаціць маёмасныя падаткі. З гэтай колькасці 500 тысяч паведамленняў ужо накіраваны ў асабістыя кабінеты плацельшчыкаў на партале падатковых органаў, каля 3 мільёнаў цяпер накіроўваюцца паштовай сувяззю. Усе паведамленні плацельшчыкі атрымаюць ва ўстаноўлены тэрмін — да 1 верасня. Падатковыя органы самастойна вылічаюць падаткі адносна ўсіх аб'ектаў падаткаабкладання ў краіне незалежна ад таго, дзе знаходзіцца нерухомасць, дзе зарэгістраваны транспартныя сродак. І на ўсе тры віды падаткаў прадугледжана адзінае паведамленне, што вельмі зручна. Там ёсць агульныя сумы, рэквізіты для плацяжу», — сказаў Андрэй Кавалеўскі.

А можа такое быць, калі апавяшчэнне не паступіць па нейкай прычыне? Што рабіць грамадзянам у такім выпадку? У маёй сям'і, напрыклад, падобная сітуацыя здарылася летась. Тады заўсёды можна звярнуцца ў падатковы орган па месцы жыхарства і атрымаць копію паведамлення. Або тлумачэнні, чаму плаціць не трэба, як у нашым выпадку. Другі варыянт — зарэгістраваць асабісты кабінет плацельшчыка, калі раней гэтага не рабілі, і ў спецыяльным функцыянале сфарміраваць паведамленне. Калі зарэгістраваць асабісты кабінет у верасні—кастрычніку, то, нягледзячы на тое, што паведамленне выходзіла на паперы, функцыянал дазволіць сфарміраваць яго на падставе даных інфармацыйных рэсурсаў падатковых органаў і азнаёміцца ў рэжыме анлайн. «У паведамленні зручна прыведзены спосабы выплаты падаткаў, у прыватнасці, размешчаны QR-коды, кароткія коды для плацяжу АРІП. Выплата можа рабіцца датэрмінова або некалькімі плацяжамі», — заўважыў Андрэй Кавалеўскі.



Калі ёсць пытанні па прад'яўленых да выплаты сумах па падатках на нерухомую маёмасць і зямельным, можна звярнуцца ў падатковы орган па месцы размяшчэння аб'екта нерухомай маёмасці або зямельнага ўчастка, па транспартным падатку — у падатковы орган па месцы жыхарства (месцы рэгістрацыі). Інфармацыя аб кантактных тэлефонах падатковых органаў для атрымання кансультацый па маёмасных падатках фізічных асоб размешчана на афіцыйным сайце Міністэрства па падатках і зборах.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Каму і якія належаць ільготы

Шэраг грамадзян маюць ільготы па выплаце маёмасных падаткаў. Так, шматдзетныя сем'і вызваляюцца ад выплаты падаткаў на ўсе аб'екты нерухомай маёмасці. Але пры ўмове, што на ўтрыманні і выхаванні знаходзяцца трое і больш дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў. Калі старэйшыя дзеці ўжо дасягнулі 18-годдзя і ў сям'і менш чым тры непаўналетнія, сям'я для мэт падаткаабкладання ўжо не разглядаецца як шматдзетная і льгот няма.

Акрамя таго, за адну кватэру не трэба плаціць падатак, калі яна належыць асобам, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту (мужчыны — 63 гады, жанчыны — 58 гадоў), інвалідам першай і другой групы, непаўналетнім дзецям. Усе астатнія грамадзяне робяць выплату падатку нават за адну кватэру.

Пенсіянеры па ўзросце, інваліды першай і другой групы і шэраг іншых катэгорый таксама вызвалены ад падатку на адзін жылы дом. А калі ў пенсіянера ва ўласнасці адзін жылы дом і адна кватэра, абодва аб'екты не абкладаюцца падаткам. А калі дзве кватэры, то за другую трэба выплачваць падатак. Пры гэтым у падатковым заканадаўстве прапісана, што ў дадзеным выпадку ад падатку на нерухомасць вызваляецца тая кватэра, кошт якой вышэйшы.

Акрамя таго, для такіх катэгорый фізічных асоб вызваляецца ад падаткаабкладання любая колькасць садовых домікаў, гаражоў, машынамесцаў, лецішчаў. «А іншыя аб'екты нерухомасці — скажам так, камерцыйная нерухомасць — абкладаюцца падаткам для ўсіх катэгорый фізічных асоб», — заўважыў Андрэй Кавалеўскі.

Аналагічныя льготы прадугледжаны адносна зямельнага падатку. Калі па нейкай прычыне льгота не выдзелена плацельшчыку, які мае на яе права, трэба звярнуцца ў падатковы орган і ўдакладніць, якія дакументы трэба прад'явіць для пацвярджэння права на льготу. Практыка папярэдніх гадоў паказвае, што такія выпадкі адзінкавыя, гэта вынік збояў у апрацоўцы вялікага аб'ёму даных. Калі фізічная асоба звяртаецца, падатковыя органы разбіраюцца і ліквідуюць недахопы.

Асобна Андрэй Кавалеўскі спыніўся на нюансах па транспартным падатку. «Ім абкладаюцца транспартныя сродкі, зарэгістраваныя за фізічнымі асобамі ў органах ДАІ. Праводзілася актыўная кампанія, каб тыя, у каго ёсць так званы аўтахлам, які не выкарыстоўваецца, даўно разабраны або згніў, маглі ў спрошчаным парадку зняць такія транспартныя сродкі з уліку. Галоўная ўмова — транспартны сродак сапраўды не эксплуатуецца, не ўдзельнічае ў дарожным руху», — падкрэсліў начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб міністэрства.

Па транспартным падатку крыху іншы парадак атрымання льгот. Так, ад падатку вызваляюцца транспартныя сродкі, выпушчаныя да 1992 года, а таксама электрамабілі, якія рухаюцца выключна электрычным рухавіком. Ільгота для электрамабіляў дзейнічае да канца 2025 года. Стаўка падатку паніжаецца на 50 працэнтаў, калі транспартны сродак зарэгістраваны ў органах ДАІ на пенсіянера па ўзросце, інваліда першай і другой групы, аднаго з бацькоў у шматдзетнай сям'і. Але і тут ёсць адна ўмова: у такой асобы павінна быць сапраўднае вадзіцельскае пасведчанне адпаведнай катэгорыі. Для інвалідаў трэцяй групы стаўка транспартнага падатку паніжаецца на 25 працэнтаў пры той жа ўмове.

## Да пені справу лепш не даводзіць

«Пені налічваюцца за любую нявыплату падаткаў. Агульны памер прывязаны да стаўкі рэфінансавання. На дадзены момант памер пені за месяц — менш за адзін працэнт ад сумы падатку. Гэта невялікія сродкі. Але мы ўсё ж арыентуем нашых плацельшчыкаў на тое, што неабходна рабіць выплату ва ўстаноўлены тэрмін — да 15 лістапада, каб не допускаць пені, мер адміністрацыйнага спагнання і не даводзіць да прымусовага выканання падатковых абавязацельстваў», — адзначыў Андрэй Кавалеўскі.

Падатковыя органы аналізуюць паўнату і своечасовасць выплаты маёмасных падаткаў і пры неабходнасці прымаюць меры па іх спагнанні. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягваюць толькі ў крайнім выпадку. У першую чаргу падатковыя органы працуюць на папярэджанне. Асобы, якія не заплацілі падаткі своечасова, атрымліваюць СМС-паведамленні папераджальнага характару. Прычым прадугледжана некалькі хваляў рассылкі. Калі прэвентыўныя меры не прынеслі жаданага выніку, падатковыя органы па заканадаўстве абавязаны праводзіць працэдуры па прымусовым выкананні падатковых абавязацельстваў.

## Што адметнага ёсць сёлета?

«З 2021 года ў Беларусі замест дзяржаўнай пошліны за выдачу дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху ўведзены транспартны падатак. І ў тым годзе грамадзяне ўносілі авансавы плацеж, а ў 2022 годзе ішла даплата за 2021-ы. У бягучым годзе фізічныя асобы правядуць паўнацэнную выплату транспартнага падатку за 2022 год. «Натуральна, сумы ў 2021-2022 гадах былі меншыя ў параўнанні з тымі, якія адлюстраваны ў цяперашніх паведамленнях. Тады падатак выплачваўся часткова, а цяпер поўнасцю», — расказаў Андрэй Кавалеўскі.

Раней падатак на нерухомую маёмасць і зямельны падатак выплачваліся на працягу года за бягучы год. Пасля было прынята рашэнне, што гэтыя падаткі будуць выплачвацца пасля завяршэння года. 2022-ы стаў пераходным перыядам. Грамадзяне ў 2022-м заплацілі авансавы плацеж у памеры 50 працэнтаў ад сумы. А да лістапада 2023 года яны зробяць канчатковую даплату да гадавой сумы. Далей падатак будзе выплачвацца за папярэдні год, гэта значыць, у 2024-м за 2023-ы.

Такім чынам, у наступным годзе адбудзецца паўнацэнны пераход на выплату падаткаў пасля завяршэння года, гэта значыць, у 2024-м усе віды маёмасных падаткаў будуць выплачвацца за 2023 год. Пераходныя перыяды скончацца, авансавых плацяжоў не будзе, застанецца паўнацэнная выплата.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

---

Будзь у курсе!

# У сталіцы з'явіцца адзіны праязны

**З 16 жніўня Мінскі гарвыканкам уводзіць адзіны праязны на ўсе віды гарадскога пасажырскага транспарту.**

Аптымізацыі колькасці і кошту існуючых праязных дакументаў папярэднічала вялікая работа па вывучэнні адпаведных меркаванняў і патрэб жыхароў сталіцы. Каб высветліць найбольш прымальную для пасажыраў сістэму праязных дакументаў, праводзіліся шматлікія сустрэчы з маладзёжным актывам, з гарадскім аб'яднаннем прафсаюза, вывучаліся меркаванні падчас сустрэч з працоўнымі калектывамі і насельніцтвам мікрараёнаў.

Пасля разгляду зваротаў гэтае пытанне выносілася на абмеркаванне дэпутацкага корпуса сталіцы. Атрыманыя звесткі дазволілі выпрацаваць падыходы да ўвядзення адзінага праязнога, які забяспечваюць інтарэсы розных груп грамадзян.

Як інфармуе дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс», галоўнае навеўвядзенне заключаецца ў тым, што выкарыстанне адзінага праязнога створыць дадатковыя зручнасці пасажырам і дасць магчымасць на працягу дня здзяйсняць неабмежаваную колькасць перасадак на чатырох відах транспарту. Гэта вельмі актуальна для павышэння мабільнасці грамадзян ва ўмовах сучаснага мегаполіса — сталіцы краіны.

Адзіны праязны не прывязаны да пэўнага віду транспарту: калі няма прамога маршруту, то ў пасажыра з'яўляецца магчымасць перасаджвацца неабходную колькасць разоў на аўтобус, тралейбус, трамвай або метро, дабіраючыся да пункта прызначэння. Адсутнасць неабходнасці пры перасадцы кожны раз набываць новы



талон эканоміць час паездкі і фінансы пасажыра.

У выпадку аператыўнай замены аднаго віду транспарту на другі, пры ўстараненні аварыйных сітуацый на дарозе, правядзенні дарожных работ або масавых мерапрыемстваў адзіны праязны дазволіць пасажыру камфортна здзяйсняць паездкі без прывязкі да аднаго віду транспарту.

Для найбольш актыўных людзей гэта магчымасць неабмежаванай мабільнасці за ўмераную цану: кошт праязнога на 30 сутак або месяц на гарадскія перавозкі пасажыраў усімі відамі транспарту, уключаючы экспрэс, складае 51,05 рубля. Пры гэтым для жыхароў, якія традыцыйна аддаюць перавагу толькі аднаму віду транспарту, захавана магчымасць яго выкарыстання па ранейшым кошце: 38,25 рубля — аўтобусамі (уключаючы аўтобусамі экспрэс), тралейбусамі ці трамваямі; 40,50 рубля — электрацягнікамі метрапалітэна.

Такое новаўвядзенне стане чарговым, але не апошнім крокам да павышэння ўзроўню транспартнага абслугоўвання жыхароў сталіцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПІЛІ-ЕЛІ, ПАКУЛЬ НЕ ЗАПЕЛІ

## Два дні шумеў-гуляў фестываль «Мотальскія прысмакі»

**Калі вы не бачылі, як каўбасы вязуць па вуліцы трактарам, як з яблыкаў будуюць цэлую піраміду, як капу звычайнай саломы ператвараюць у зубра, і вы не ведаеце, што такое «выхілясы», то вам дакладна сюды — у Моталь, на фальклорна-гастранамічны фестываль, які ў мінулую суботу сабраў гасцей дванаццаты раз.**



Падворак СШ №1 Моталя.

### СУСТРЭЛІ ГАСЦЕЙ З УСІХ ВАЛАСЦЕЙ

Апошнім часам фэст праводзіцца раз на два гады. У Моталь, як і раней, прыехалі тысячы людзей. На афіцыйным адкрыцці свята згадвалі, што ў розныя гады ўдзельнікамі фестывалю станавіліся госці з многіх краін. На гэты раз — Расія, Малдова, Арменія, Азербайджан, Туркменістан, Карэя, Ізраіль прадстаўлены дыяспарамі, што пражываюць на тэрыторыі Беларусі. На канцэртах гучалі песні, мільгалі танцы многіх народаў свету. «Гэта яшчэ адно сведчанне нашага адзінства, братэрства, адкрытасці», — падкрэсліў **старшыня Іванаўскага райвыканкама Анатоль ТКАЧУК**.



Як і бывае на падобных мерапрыемствах, на галоўнай вуліцы разгарнуўся вялікі горад майстроў. Рамеснікі, умельцы прадавалі ганчарны посуд, вырабы з лазы і саломы, прапаноўвалі арыгінальныя сувеніры. На фэст прыехала больш за сотню майстроў з розных куткоў Беларусі. Было шмат вышываных вырабаў, багата прадстаўлены ткацтва, вязанне, а таксама сучасныя віды мастацтва (бісерапляценне, кампазіцыі з сухацветаў і шмат іншых). Прадукцыю прапаноўвалі і гандлёвыя арганізацыі. Так што ніхто — дакладна — без падарунка сабе альбо блізкім не з'ехаў.

Але ж баль, як заўсёды, правілі прысмакі. Зранку наведвальнікаў фестывалю сустракалі самыя розныя гастранамічныя падворкі. Іх падрыхтавалі школы, сельскія Саветы, дамы культуры, сельгаспрадпрыемствы і руплівыя мотальскія гаспадыні.

### УСЕ ЛАСЫ НА МЯСЦОВЫЯ КАЎБАСЫ

Да аднаго самадзейнага павільёна-падворка проста нельга было не падысці. Вабілі не толькі пах і выгляд смачных страў, але і «наглядная агітацыя». Там віселі чыста мотальскія лозунгі, напрыклад такія: «Хто як йісць — той так і робыць», або «Не поісы коўбасы — не потянэш косы», далей «На мотальскі коўбасы ўсі ласы» і вялікімі літарамі «Сало — гэта сыла!». А ўжо гаспадынькі гэтага павільёна — і прыгажуні, і разумніцы — як высветлілася, настаўніцы Мотальскай СШ № 1. З кожным пагамоняць, кожнаму раскажуць пра звычаі вёскі, пра стравы, пра людзей. «Мусіць, у Моталі кожны дзень каўбасу ядуць і чарачкай запіваюць», — пачынае заляцацца адзін вясёлы госць. «І не кажыце. Усе ж думаюць, што ў Моталі, калі выходзяць з хаты, то дзверы не замыкаюць, а каўбасой завязваюць», — парыруе гаспадыня Святлана Філіновіч. Не дзіва, што каля гэтай палаткі спыняліся не столькі паспытаць чаго-небудзь, колькі пагаварыць. Але ж і пачастункаў на стале хапала. І сала, і мяса, і дранікі — прадавалі за сімвалічную цану — па рублі.

Раённая бібліятэка разгарнула падворак яўрэйскай кухні. Гэтым бібліятэкары займаюцца не першы раз. Стравы гатуюць па ўнікальных старадаўніх рэцэптах. Стол быў такі разнастайны, што вочы разбягаліся: эсін флэйш, фалафель, шанікі тварожныя, маіна. «Апошняе — з нядаўніх нашых знаходак, — падзяліліся прыветлівыя гаспадыні падворка, — мінулы раз такой стравы не было, рэцэпт прынёс пастаянны чытач бібліятэкі. Вырашылі прыгатаваць — гэта рулет з ялавічынай, расходзіцца на ўра».

Збоку ад стала — стэнд з апісаннем, рэцэптамі прыгатавання кожнай стравы, коштам дэгустацыі. Госці падыходзяць, каштуюць, затым знаходзяць страву на стэндзе і шчоўкаюць тэлефонамі. Асабліва ахвотна куплялі піражкі з рознымі начынкамі, мы пакаштавалі з яблыкам і сведчым: смак — пальчыкі абліжаш. Калега, што сілкавалася маінай, таксама была ў захапленні. «У многіх стравах яўрэйскай кухні асновай з'яўляецца цеста, а яго трэба рабіць з любоўю, — падзяліліся сакрэтам гаспадыні. — І тады рулеты, фаршмакі, стравы з курыцы і рыбы атрымаюцца надзвычай смачнымі».

Сярод жыхароў Моталя ёсць пастаянныя ўдзельнікі фэстаў. Такія, напрыклад, як Ніна Кульбеда. Ніна Мікалаеўна прымае ўдзел у кулінарным свяце з самага першага фестывалю. Цяпер жанчына паважнага ўзросту перадае свае сакрэты, а таксама бабуліны рэцэпты ўнучцы Галіне, лічыць яе сваёй прадаўжальніцай. Галіна стала дарослай і з дапамогай бабулі гатуе многа рознай смакаты. Госці заўсёды адзначаюць вытанчаны смак баршчу, розных відаў каўбасы, запечаных гусі і качкі — і шмат чаго яшчэ з кухні Ніны Кульбеды. Яна чалавек вядомы ў Моталі. Каля трох дзясяткаў гадоў адпрацавала ў мясцовай пякарні, для ўсёй вёскі гатавала вясельныя караваі. А яшчэ спявала ў народным калектыве «Мотальскія суседкі». Лічыць, што пачастункі будуць смачнейшымі, калі іх гатаваць з душой, з пазітыўным настроем.

Яшчэ адна пазнавальная ўдзельніца «прысмакаў» — Вольга Собалева. Пазнавальная, бо ўжо тройчы станавілася ўдзельніцай тэлевізійнай гастранамічнай перадачы «Беларуская кухня». Вольга Іванаўна глядзіць кулінарныя шоу, чытае адпаведную літаратуру, сама прыдумвае рэцэпты. Яе фішка — рыбныя стравы: фаршыраваны шчупак, карасі ў смятане, біточкі са шчупака. А яшчэ яна гатуе самыя розныя мясныя стравы па бабуліных рэцэптах.

### ...І ПІРАМІДА ЯБЛЫКАЎ

Кожны з падворкаў, несумненна, меў сваю адметнасць: частавалі стравамі, наліўкай, медавухай, дэгустацыю якой наладзілі пчаляры. І не толькі «смачная» праграма свята прываблівала гасцей. Яго афіцыйнаму адкрыццю папярэднічала яркае тэатралізаванае шэсце, якое арганізатары назвалі «У адзінстве міру і сяброўства». Урачыстым маршам з музыкай, песнямі прайшлі творчыя калектывы розных дыяспар, праехалі святочныя экіпажы з гістарычнымі персанажамі, а таксама імправізаваныя выставы на колах мясцовых прадпрыемстваў. Напрыклад, везлі маляўнічую вітрыну з сырамі ў рабінавых вянках. Усе гледачы літаральна зашчоўкалі тэлефонамі, калі міма праязджаў трактар з арыгінальна афармленым прычэпам каўбас. Трактар пад капелюшом прадпрыемства «Моладава-Агра» нагадваў дэкарацыі сапраўднага спектакля на фальклорна-аграрную тэму.

А вось сельгаспрадпрыемства «Агра-Моталь» арганізавала падворак-экспазіцыю сваёй прадукцыі і дасягненняў. Яблычная піраміда стала асаблівай пляцоўкай для сэлфі, яна прывáблівала і дзяцей, і дарослых. Многія зацікавіліся вялікай выставай бульбы. Гаспадарка актыўна вырошчвае другі хлеб, пастаўляе бульбу ў розных відах прадпрыемствам грамадскага харчавання, школам, бальніцам. «Агра-Моталь» мае нават сваю лабараторыю бязвіруснага вырошчвання бульбы, пра што расказала нам яе загадчыца Юлія Шыкалай. Юлія падкрэсліла, што яны не выводзяць новыя сарты, а адаптуюць розныя, у тым ліку замежныя да нашых умоў, «вучаць» клубні быць неўспрымальнымі да ўзбуджальнікаў розных хвароб. Таму бульбачка расце такой прыгожай і здаровай — адна ў адну.




Практычна без перапынку працавала канцэртная пляцоўка фестывалю, было шмат музыкі, танцаў, забаўлянак. Фестываль наведалі старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый Шулейка, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Валерый Вакульчык, іншыя ганаровыя госці.

Варта адзначыць дакладную арганізацыю фестывальнага працэсу. Работнікі райвыканкама, галіны культуры вырашалі арганізацыйныя пытанні хутка і дакладна, літаральна за руку маглі адвесці на любую фестывальную пляцоўку таго, хто звярнуўся па дапамогу.

У нядзелю, у другі дзень фэсту, адбыўся круглы стол «Нацыянальная кухня — ключ да дружбы народаў», прайшлі выстава-кірмаш выпечкі, мнагажанравы фестываль дзіцячай і юнацкай творчасці, стол сяброўства «Прысмакі для гасцей з усіх валасцей». І завяршыў свята гала-канцэрт з узнагароджаннем калектываў-удзельнікаў.



**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ООО «АСБ Лизинг» (Продавец)**

Аукцион состоится **31.08.2023 в 14.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 2:**
1. Здание складов, торговых баз с инв. № 500/С-23896, 1122,2 кв. м.
2. Здание специализированное розничной торговли с инв. № 500/С-22663, 464,8 кв. м.
3. Здание специализированное розничной торговли с инв. № 500/С-22666, 482,6 кв. м.
4. Здание специализированное розничной торговли с инв. № 500/С-22966, 554,5 кв. м.

Адрес: г. Минск, ул. Уручская, 19Б/12, 19Б, 19Б/2, 19Б/3.
Обременения – аренда.
Земельный участок площадью 7,7124 га с кадастровым номером 500000000009000652.
Право общего долевого постоянного пользования, доля: 57/625.
На земельном участке расположены иные объекты недвижимости, которые не выставлены на аукцион.
Начальная цена с НДС 20 % – 1 040 000,00 руб. Задаток – 50 000,00 руб.
Шаг аукциона – 5 %. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона, – ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатка – 29.08.2023 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
• Взыскание задолженности
• Проведение торгов
• Ликвидация
• Юридические услуги

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н Сайты в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29 |

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот № | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, в бел. руб. | Минимальная цена с учетом НДС 20 %, в бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **1** | **Автомобиль Nissan Qashqai,** 2019 года выпуска, черного цвета, номер кузова Z8NFBNJ11ES088379 | 63 600,00 | 50 880,00 |

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота либо цены за лот, складывающейся в ходе торгов.
В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 10 (десять) календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу:** https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **1 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 14.09.2023 начало торгов – 10.00, окончание торгов – 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Торги проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 13.09.2023 г. до 16.00** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

---

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества унитарного предприятия «Вилейское СМУ ОАО «Минскводстрой»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Ножницы комб., инв. № 50 | 540,00 | 54,00 | 27,00 |
| 2 | Персональный компьютер, инв. № 157 | 3,90 | 0,39 | 0,20 |
| 3 | Мотопомпа бензиновая высоконапорная SERM50VBAA, инв. № 143 | 219,00 | 21,90 | 10,95 |
| 4 | Автомобиль ГАЗ-32213-408 сл. кузов, инв. № VIL00208 | 930,00 | 93,00 | 46,50 |
| 5 | Автомобиль ГАЗ-32213-414, инв. № 62 | 300,00 | 30,00 | 15,00 |
| 6 | Бензопила «Штиль» MS 250 (без цепи и шины), инв. № 186 | 90,00 | 9,00 | 4,50 |
| 7 | Полуавтомат для сварки инверторный MIG500A/MMA, инв. № 203 | 450,00 | 45,00 | 22,50 |
| 8 | Холодильник МХМ-2808-90. сер-т BY/112 03/06/002, инв. № 139 | 66,00 | 6,60 | 3,30 |
| 9 | Станок верт.-сверл. 2Н135, инв. № 233 | 990,00 | 99,00 | 49,50 |
| 10 | Станок попер.-стр. 7Б35, инв. № 236 | 690,00 | 69,00 | 34,50 |
| 11 | Сканер CANON 400 2996C010, инв. № 218 | 90,00 | 9,00 | 4,50 |
| 12 | Монитор ЖКИ, инв. № 70 | 9,00 | 0,90 | 0,45 |
| 13 | Сварочный полуавтомат ПДГ-354, инв. № 115 | 210,00 | 21,00 | 10,50 |
| 14 | Монитор LCD Philips, инв. № 100 | 9,00 | 0,90 | 0,45 |
| 15 | Принтер Phaser 3150, инв. № 79 | 19,80 | 1,98 | 0,99 |
| 16 | Сварочный генератор WAGT 220DC HSB, инв. № 140 | 177,00 | 17,70 | 8,85 |
| 17 | Персональный компьютер, инв. № 165 | 3,90 | 0,39 | 0,20 |
| 18 | WK330EA Ноутбук HP Probook 4520s i333M 15 4GB/500, инв. № 149 | 48,00 | 4,80 | 2,40 |
| 19 | Компьютер без монитора, инв. № 88 | 3,90 | 0,39 | 0,20 |
| 20 | Монитор ЖК, инв. № 89 | 9,00 | 0,90 | 0,45 |
| 21 | Под. мех. ПДГ-312, инв. № 43 | 51,00 | 5,10 | 2,55 |
| 22 | Монитор LCD Philips, инв. № 99 | 9,00 | 0,90 | 0,45 |
| 23 | Теодолит 3Т2КП, инв. № 94 | 600,60 | 60,06 | 30,03 |
| 24 | Агрегат сварочный АДД-4004 МУ1, инв. № 78 | 1716,00 | 171,60 | 85,80 |
| 25 | Влагомаслоотд. ВМО 60, инв. № 57 | 452,40 | 45,24 | 22,62 |
| 26 | Выпрямитель, инв. № 6 | 429,00 | 42,90 | 21,45 |
| 27 | Водоотливная уст-ка, инв. № 15 | 4758,00 | 475,80 | 237,90 |
| 28 | Плоттер HP Desjqnjet 111 Roll, инв. № 137 | 179,40 | 17,94 | 8,97 |
| 29 | Агрегат отопительный АО-ЭВ02-15кВт, инв. № 119 | 218,40 | 21,84 | 10,92 |
| 30 | Персональный компьютер, инв. № 160 | 73,32 | 7,33 | 3,67 |
| 31 | П/прицеп-1212, инв. № 63 | 2496,00 | 249,60 | 124,80 |
| 32 | Телевизор «Горизонт» с подставкой, инв. № 141 | 68,64 | 6,86 | 3,43 |
| 33 | П/автомат свар., инв. № 20 | 1560,00 | 156,00 | 78,00 |
| 34 | Диван-кровать двухместный «Клад»-15.6 с двумя креслами, инв. № 142 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 35 | Контейнер металлический М-К2-2-13, инв. № 117 | 64,74 | 6,47 | 3,24 |
| 36 | ПЭВМ, инв. № 54 | 8,58 | 0,86 | 0,43 |
| 37 | Принтер, инв. № 55 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 38 | Трансформатор, инв. № 10 | 218,40 | 21,84 | 10,92 |
| 39 | Падающий мех. ПДГ-312, инв. № 80 | 63,18 | 6,32 | 3,16 |
| 40 | Аппарат факс «Панасоник», инв. № 59 | 10,92 | 1,09 | 0,55 |
| 41 | Пылесос промышленный AS 600 inox, инв. № 182 | 319,80 | 31,98 | 15,99 |
| 42 | Виброплита YS-244, инв. № 132 | 187,20 | 18,72 | 9,36 |
| 43 | Кран мост. электр. однобал. опорный 2 т, 11,5 м, инв. № 86 | 3120,00 | 312,00 | 156,00 |
| 44 | Опалубка (соед. болт 456 шт. х 14099 и панель100х125 – 12 шт.), инв. № 131 | 546,00 | 54,60 | 27,30 |
| 45 | Принтер, инв. № 72 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 46 | Кран-балка 3 т, 12 м, инв. № 257 | 3276,00 | 327,60 | 163,80 |
| 47 | Выпрямитель ВДУ-506С УЗ (380В0 с падающим мех. ПДГО-510 УЗ.1), инв. № 154 | 1560,00 | 156,00 | 78,00 |
| 48 | П/прицеп МЕТАКО 2309, инв. № 90 | 5694,00 | 569,40 | 284,70 |
| 49 | Компьютер в сборе DELTA и сист. блок intelPentium G5500 монитор LG, инв. № 209 | 65,52 | 6,55 | 3,28 |
| 50 | Многофункциональное устройство CANON MF-4450, инв. № 153 | 210,60 | 21,06 | 10,53 |
| 51 | Л/автомат свар., инв. № 37 | 319,80 | 31,98 | 15,99 |
| 52 | ПЭВМ Pentium DCE 2200, инв. № 102 | 8,58 | 0,86 | 0,43 |
| 53 | Установка 12561, инв. № 39 | 2340,00 | 234,00 | 117,00 |
| 54 | WK330EA Ноутбук HP Probook 4520s i333M 15 4GB/500, инв. № 151 | 124,80 | 12,48 | 6,24 |
| 55 | Агрегат отопительный АО-ЭВО.2-15кВт, инв. № 120 | 218,40 | 21,84 | 10,92 |
| 56 | WD848EA Ноутбук HPProBook4520si333M 15.6QB/320QB, инв. № 147 | 124,80 | 12,48 | 6,24 |
| 57 | Монитор LCD 190S8FB\00, инв. № 105 | 23,40 | 2,34 | 1,17 |
| 58 | WD848EA Ноутбук HP ProBook4520si333M 15.6QB/320QB, инв. № 148 | 124,80 | 12,48 | 6,24 |
| 59 | Принтер Canon LBR3000, инв. № 106 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 60 | Картина, инв. № 332 | 7,80 | 0,78 | 0,39 |
| 61 | Трансформатор сварочный ТДМ-504-1 У2, инв. № 134 | 608,40 | 60,84 | 30,42 |
| 62 | Персональный компьютер MYG-I5-760-P55A, инв. № 156 | 73,32 | 7,33 | 3,67 |
| 63 | Персональный компьютер MYG-I5-760-P55A, инв. № 155 | 65,52 | 6,55 | 3,28 |
| 64 | Холодильник, инв. № 49 | 35,10 | 3,51 | 1,76 |
| 65 | Гайка М12 (141 шт.); Болт 30х260 кор 30 кг цинк (443,30 шт.); Болт с шестигр. головкой М20х80 DIN933 прочн. 8,8 цинк (уп./10 шт.), 5 шт.; Лампа паяльная б/у, 2 шт.; Тачка садовая Skiper 1*85 Fermer; Тачка прессованная 2 колеса 100 л; Поддон ПВ2-2 (возвратная тара), 9 шт.; Поддоны, 2 шт.; Поддон П2-5; Подшлемник б/у, 2 шт.; Рукав напорно-всасывающий В-2-38-3 10 м, 12 шт.; Штангенциркуль ШЦ-250 (0,05 мм); Лампа H7 12V 55W; Лента Герлен АГ 45*2, 278 шт.; Ремень 887; Ремень 1400; Ремень 12206PK; Ремень 937; Ремень 1370 6 PK | 7291,44 | 729,14 | 364,57 |
| 66 | Сварочный инвертор ПАТОН ВДИ-250Р СН № 2506715Р; Соед. прокл. Ф 14В 150/170, 2 шт.; Вентиль ф.32, 2 шт.; Вентиль Ду-15, 5 шт.; Задвижка чуг. Ду50 Ру16, 2 шт.; Фланец соед. (муфта) для п/э Ду 63х2 (фл. DN50); Водомер ф80; Водомер ф320, 4 шт.; Переход муф.-флан. 63*2, 6 шт.; Задвижка шиберная Ду 100; Труба ПЭ 100 SDR11 20х2,0 питьевая, 24,74 шт.; Ревизия ПВХ нк 250, 2 шт.; Держатель желоба водосточного ДЖВ 150/4,0*25-Пэ-Д-RAL3003, 21 шт.; Желоб водосточный ЖВ 120-L-0,5-ЛКПЦ-Пэ-С-RAL-7024, 3 шт.; ПП-соединитель 1-ур. Для ПП 60*27/краб/, 59 шт.; Трансформатор б/у; Задвижка фланц. RC dn 100F 4 PN 10/16 с маховиком; Подъемный механизм; Профиль РС-Н10 по 6 м прозрачный, 6 шт.; Тройник 87*160, 9 шт.; Тройник ПВХ 160*110*90, 53 шт.; Тройник Т200*100; Тройник ПВХ нк 200/110/45, 2 шт.; Тройник ПВХ нк 250/110/45; Тройник ПВХ нк 315/110/45, 14 шт.; Тройник ПВХ НК 160/110, 55 шт.; Фланец свободный стальной для ПЭ трубы д. 63; Тройник прох. цил. к/ц, 6 шт.; Головка переходная ГП50*80; Прокладка ГБЦ 406 с гермет.; Прокладка ГБЦ 245; Держатель желоба ДЖВ 150/4*25-ЛКПЦ-Пэ-Д RAL 7004, 152 шт.; Отвод НПВХ 160*45, наружная канализация, 8 шт.; Муфта НПВХ 160 Двухраструбная наружная канализация, 6 шт.; Ревизия НПВХ 160 наружная канализация, 2 шт.; Держатель трубы водосточной ОТВ 100/0,5-О, 30 шт.; Желоб водосточный | 10470,86 | 1047,09 | 523,54 |
| 67 | Одеяло 1-сп. б/у, 2 шт.; Одеяло 1,5-сп., 2 шт.; Одеяло 1,5-сп., 5 шт.; Одеяло 1400*2050, РФ, 7 шт.; Одеяло шерст. 1400*2050 РФ, 10 шт.; Правило алюминиевое «Трапеция» 2,0 м; Рулетка измерительная 7,5/25 мм, 6 шт.; Уровень 1,0 м. 3-глазк. бруск.; Уровень 1,0 м, 3-глазк.; Вилка стол., 9 шт.; Папка кож.; Наушники СОМ3-3, 2 шт.; Рулетка измерительная 5 м/25 мм, 4 шт.: Рулетка 7,5м*25 мм; Рулетка 10м/25мм пласт. Корп. STARTUL MASTER (ST-3002-1025), 2 шт.; Простыня б/у, 8 шт.; Простыня б/у, 3 шт.; Наушник противошумный; Аптечка трансп., РБ; Аптечка транспортная РБ; Аптечка первой мед. помощи универсальная (футляр), 3 шт.; Аптечка автомобильная; Аптечка первой мед.помощи, универс., 4 шт.; Каска рабочая/«Труд»/РФ, 2 шт.; Каска защитная «Луч», оранж., 9 шт.; Стол бильярдный, б/у, 1 шт.; Бак, 22 л, б/у | 914,40 | 91,44 | 45,72 |
| 68 | Виброрейка; Вибронаконечник б/у, 2 шт.; Телефонный аппарат проводной ТХ-205; Калькулятор SDS 395, 2 шт.; Калькулятор Citizen SDS, 6 шт; Телефонный аппарат Texet TX-212; Телефонный аппарат проводной ТХ-249; Мобильный телефон; Мобильный телефон TeXet TM-B114; Моб. телефон Nokia, 7 шт.; Моб. Тел. Nokia 6303, 2 шт.; Моб. тел. Nokia 1208; Моб. тел. Nokia, 4 шт.; Мобильн. тел. Nokia; Мобильн. тел. Nokia; Мобильн. тел. Nokia, 2 шт.; Мобильный телефон б/у; Мышь Logitech; Мышь Logitech, 4 шт.; Угломер с нониусом 0-320* тип 2 (+4 калибровка РБ), 1 шт.; Шаблон сварщика УШС-2; Гигрометр Testo 606-1 (для измерения влажности строит. матер.) | 1312,80 | 131,28 | 65,64 |
| 69 | Ключ трубный КТР-3 (НИЗ); Ножницы арматурные 600 м; Угольник 350 мм, алюминиевый; Дозатор HDM 500 CR/CB чемодан; Струбцина G-образная «Profi» 6»-150мм (вес – 1,73 кг), 2 шт.; Верт. разметка 2,1,1 (1,0*0,3), 2 шт.; Печь СВЧ Horizont 23MW800-1379 CBS; Радиатор масляный Polaris PRE R 0715, 3 шт.; Печь микроволновая бытовая Midea MM720CPI; Выключатель, 70 шт.; Электросчетчик ЭЭ800312; Манометр МП 160 1,0 Мпа, 2 шт.; Микрометр МК250; Круг г/к Ст. 3 30, 0,165 т; Домкрат 5 тонн (бутыл.); Обогреватель | 1157,94 | 115,79 | 57,90 |
| 70 | Сапоги ПВХ мужские Step (h-35) (44); Сапоги ПВХ мужские Step (h-35) (45); Чайник б/у; Чайник б/у, 2 шт.; Щетка для уборки 500Х50Х75 мм; Радиатор «Ясельда», РБ; Полутерок 12Х100 см п/уретанов., 2 шт.; Д/зн 5,15 (2 т.р.) (S=0,36м²); Д/зн 4,2,2 (2 т.р.) (S=0,283 м²); Д/зн 4,2,1 (2 т.р) (S=0,283 м²); Картина б/у; Картридж черный № 82 CH565A; Картридж HP 82 струйный, черный; Картридж HP L 10/0; Картридж HP, 2 шт.; Чайник эл. Polly, 3 шт.; Стол журнальный «Этюд»; Шкаф 2000*450*2550; Шкаф под сейф; Ель искусств. Классич. 3,0 м; Вентилятор элеткрический настольный ACF-081 Normann, арт. ACF-081; Вентилятор электрический напольный ACF-191 Normann, арт ACF-194; Шкаф-стеллаж, 3 шт.; Шкаф одежный, 19 шт. | 5654,40 | 565,44 | 282,72 |
| 71 | Строительная бытовка, инв. № 508 | 4440,00 | 444,00 | 222,00 |
| 72 | Строительная бытовка, инв. № 509 | 3240,00 | 324,00 | 162,00 |

В отношении лотов №№ 1–22 проводятся седьмые повторные торги. **Стоимость снижена на 75 %.** Ранее публикация о торгах размещалась в газете «Звязда» № 21 (29901) от 02.02.2023, стр. 10, № 55 (29935) от 23.03.2023, стр. 15, № 75 (29955) от 20.04.2023, стр. 10, № 91 (29971) от 16.05.2023, стр. 10, № 107 (29987) от 07.06.2023, стр. 14, № 124 (30004) от 30.06.2023, стр. 14, № 143 (30023) от 27.07.2023, стр. 11.
В отношении лотов №№ 23–64 проводятся третьи повторные торги. **Стоимость снижена на 35 %.** Ранее публикация о торгах размещалась в газете «Звязда» № 91 (29971) от 16.05.2023, стр. 10, № 124 (30004) от 30.06.2023, стр. 14, № 143 (30023) от 27.07.2023, стр. 11.
В отношении лотов №№ 65–72 проводятся первые торги

Местонахождение лотов: 222410, Минская область, Вилейский район, г. Вилейка, ул. 1 Мая, д. 97б

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **В отношении лотов №№ 1–64: 28 августа 2023 года в 12.00 (регистрация – с 11.30 до 11.55)** **В отношении лотов №№ 65–72: 15 сентября 2023 года в 12.00 (регистрация – с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | В отношении лотов №№ 1–64: с 10.00 15 августа 2023 года до 16.00 24 августа 2023 года В отношении лотов №№ 65–72: с 10.00 15 августа 2023 года до 16.00 13 сентября 2023 года |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту __, Унитарное предприятие «Вилейское СМУ ОАО «Минскводстрой», проводимых __.__.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127.
Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов **– Чеслав, +375299999112.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **Унитарное предприятие «Вилейское СМУ ОАО «Минскводстрой», в лице ликвидатора – ООО «Центр антикризисных проектов», тел.: 80172552928; +375293489225 (222410, Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. 1 Мая, д. 97б)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

Суботнім вечарам

# Пад гукі вальса і не толькі

## Больш як сто дам і кавалераў вальсавалі ў Гомелі

**У горадзе над Сожам Другі агульнагарадскі баль сабраў аматараў класічнай танцавальнай культуры з Гомеля, Мінска і Бабруйска. Гомель працягвае традыцыю свецкіх раўтаў у гонар гадавіны свайго заснавання. Летась І агульнагарадскі баль прайшоў у знакавым гістарычным месцы — каля Гомельскага палацава-паркавага ансамбля. Тады ў танцах на набярэжнай Сожа кружылі звыш 30 пар. Цяпер жа ў гонар 881-га дня нараджэння, які горад адзначыць у верасні, баль аб'яднаў звыш 50 пар. З-за дажджу свята прайшло не пад адкрытым небам, а на паркеце залы Гомельскай абласной філармоніі.**

«Працэрці рукой люстэрка» ў рытме «Пырскаў шампанскага»... На танцавальным слэнгу аб дэталях выканання розных па могуць шмат расказаць дамы і кавалеры. У бальную карту ўдзельнікаў гомельскага свецкага раўту арганізатары ўпісалі 15 танцаў: вальс знаёмстваў, марш «Карусель», полька-тройка, падэграс, танга «Пырскі шампанскага», рускі вальс, французская кадрыля і іншыя.

Пачаўся баль традыцыйна з паланэза — танца-шэсця, дзякуючы ўмеранаму тэмпу якога пары найлепшым чынам прадстаўляюць сябе і свае ўборы.

— Каля трохсот рублёў абышлося маё ўбранне. Можна сэканоміць, калі самому зрабіць прычоску і макіяж, — падзялілася распарадчыца сёлетняга балю Святлана Скоблік. — У мяне ўжо калекцыя строяў для выступленняў, можна шыць на заказ ці проста купіць у краме.

Святлана Скоблік, дарэчы, кіраўнік клубнага аб'яднання «Натхненне» Гомельскага гарадскога цэнтра культуры. Прадстаўнікі клубных аб'яднанняў бальнага гісторыка-бытавога танца гэтай установы якраз і ўвайшлі ў асноўны склад удзельнікаў балю.

Нараўне з танцорамі клубных аб'яднанняў свае выдатныя дасягненні ў бальнай справе прадэманстравалі і гомельскія школьнікі. На балі выступілі дзевяць пар аб'яднання па інтарэсах «Вальс і не толькі» Гомельскай сярэдняй школы № 47. Каторы год старшакласнікі здзяйсняюць імкненнем да захавання традыцыі баляў не толькі ў Гомелі, але і ў іншых рэгіёнах краіны.

— Акрамя таго што займаемся ў сябе ў школе, мы ўдзельнічаем у праекце «Балі па замках Беларусі». У нашым складзе — каля 70 дзяцей. Гэта вучні 9—11 класаў і нашы выпускнікі, якія працягваюць заняткі бальнай культурай, — адзначыла **настаўніца хіміі і біялогіі, кіраўнік аб'яднання па інтарэсах «Вальс і не толькі» сярэдняй школы № 47 Гомеля Аляксандра МАРОЗАВА.**



Педагог звярнула ўвагу, што пары іх гуртка не робяць складаных аўтэнтычных гарнітураў. Фішка строяў юных удзельніц — акуратнае дэкальтэ.

— Мы з дзяўчатамі адмовіліся ад крыналінаў, ад аўтэнтычнасці бальных убораў срэбранага стагоддзя на карысць дзявочых сукенак у падлогу далікатных тонаў. Вучым і выконваем каля 30 нумароў, — дадала Аляксандра Марозава.

Упершыню спецыяльна на баль у Гомель з Мінска прыехалі Настасся Гушчо і Андрэй Шчаглоўскі. Пара прадстаўляе аматарскі калектыў танца «Мінская зорка».

— Больш чым 12 гадоў займалася харэаграфіяй, калі скончыла школу, зразумела, што вельмі сумую па танцах. Наш калектыў аб'ядноўвае людзей, якія свой карысны вольны час хочуць стварaць самі. У нас займаюцца танцамі аматары бальнай культуры ад 22 да 65 гадоў. Праз танцавальны рух мы вывучаем этыкет, працуем мэтанакіравана над сваёй вытанчанай гаворкай, — распавяла Настасся Гушчо.



Дзяўчына падзялілася, што захапленне бальнай культурай памылкова лічыць дарагім задавальненнем.

— Не куплю дарагія бальныя ўборы, а прытрымліваюся стыльнай класікі. Гэта таксама такая наўмысная ідэя — даваць магчымасць бальнай сукенцы пажыць у далейшым паўсядзённым жыцці, напаўняць яго прыгажосцю, — матывуе ўдзельніца аматарскага калектыву танца «Мінская зорка».

Увогуле, на паркеце залы Гомельскай абласной філармоніі выступілі звыш 100 удзельнікаў з Гомеля, Мінска, Бабруйска.

— Наша бальная праграма разлічана як на пары, так і на тых дам і кавалераў, хто прыйшоў адзін. Асноўны склад удзельнікаў — падрыхтаваныя танцоры. Але, калі чалавек прыйшоў першы раз, гэта не значыць, што ён не выйдзе на паркет. Можна паўдзельнічаць у «Свецкім ручайку», калі парам неабходна праз рукі прапускаць танцораў. Але ёсць у праграме і паказальныя танцы, складаныя для выканання, дзе ўдзел бяруць толькі падрыхтаваныя, — патлумачыла **мастацкі кіраўнік Гомельскага гарадскога цэнтра культуры Зоя МАЛЬЧУК.**

Арганізатары пабудавалі танцавальныя блокі такім чынам, каб яны перамяжоўваліся з паэтычнымі і вакальнымі выступленнямі, музычнымі кампазіцыямі ў выкананні салістаў гарадскога цэнтра культуры і лаўрэатаў міжнародных конкурсаў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

Гарадское асяроддзе

# Побач з дойлідам, каралём і агняборцам

## Якія арт-аб'екты робяць Гродна прывабным для турыстаў

**Нядаўна ў абласным цэнтры ўрачыста адкрылі яшчэ адну пажарную вежу. Дакладней, яе мініяцюрную копію. Урачыстасць прымеркавалі да 170-годдзя пажарнай службы Беларусі. Аб'ект, які атрымаў назву «Лаўка бяспекі», адразу стаў папулярнай фотазонай гараджан і турыстаў. Дарэчы, гэта не адзіная такога роду лаўка ў гарадскім асяроддзі. Якія яшчэ скульптуры ствараюць гарадскую атмасферу? Карэспандэнт «Звязды» спыніла сваю ўвагу на самых адметных.**

Большасць арт-аб'ектаў знаходзяцца ў гістарычным цэнтры горада. Гэта і зразумела: менавіта тут найбольш архітэктурных славутасцяў, якія хочуць убачыць турысты. Ды і самі гараджане ідуць на шпацыр па адзінай у горадзе пешай вуліцы да цэнтральнай Савецкай плошчы, а потым па Замкавай да сэрца горада — Замкавага комплексу, ці Замчышча, адкуль, уласна кажучы, і пайшло будаўніцтва горада на пачатку XII стагоддзя.

За дзясятак метраў ад замкаў, паблізу старажытнай пажарнай каланчы, і ўстаноўлены нядаўна гэты самы арт-аб'ект з міні-вежай, агняборцам у старажытным адзенні і так званай лаўкай бяспекі. Такі падарунак гараджанам зрабілі супрацоўнікі абласнога ўпраўлення МНС сумесна з прадпрыемствам «Гроднааблгаз». Трэба сказаць, што гэта кампазіцыя мае свой практычны сэнс. Як паведамілі ва ўпраўленні МНС, на лаўку можна прысесці, каб паслухаць пажарнага сігнальшчыка, які роўна апоўдні падымаецца на каланчу і грае фанфары. Цяпер кожны ахвотны можа зрабіць з ім памятны здымак якраз на гэтай лаўцы. І, трэба сказаць, яна не пустуе. Сюды пастаянна падыходзяць групы гараджан і турыстаў, месца хапае ўсім. Вось і ў дзень адкрыцця сюды завітала Вольга Саўко са сваімі гасцямі з Салігорска. Яна станоўча ацаніла з'яўленне такіх арт-аб'ектаў і прыгадала яшчэ некалькі цікавых дэкаратыўных кампазіцый, якія маюць свой падтэкст.

Напрыклад, лаўка з гітарай. І хоць знаходзіцца яна таксама ў цэнтры горада, але заўважыць гэты бронзавы музычны інструмент не так проста. Месца не вельмі людное. Між тым, музычны атрыбут звязаны з імем легендарнага выканаўцы Уладзіміра Высоцкага, які ў 60-х гадах падчас здымкаў фільма «Я родам з дзяцінства» жыў у гродзенскай гасцініцы ў цэнтры горада. Як вядома, у Высоцкага ёсць беларускія карані, таму і з'явіўся гэты арт-аб'ект у памяць аб знакамітым земляку. Вось толькі лаўка выглядае не лепшым чынам і патрабуе рамонту.

Яшчэ дзве цікавыя лаўкі адносяць нас да больш старажытных часоў. Адна з іх размясцілася на плошчы Антонія Тызенгаўза, якраз каля будынка былога гродзенскага старасты.

Многія дамы ў XVIII стагоддзі будаваліся па праектах вядомых архітэктараў. Напрыклад, праект аднаўленай нядаўна ратушы выканаў знакаміты італьянскі архітэктар Джузэпэ Сако. Яго вобраз у бронзе прадстаўлены якраз побач з будынкам. Існуе меркаванне, што старажытны дойлід абмяркоўваў план гарадской забудовы з самім каралём. Абедзве фігуры зроблены ў рост чалавека. Праект ажыццяўляўся ў рамках міжнароднай праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва.

Беларускі скульптар Вадзім Мацкевіч нешк расказаў, што для скульптурнай кампазіцыі бронза адлівалася ў самай лепшай сталічнай ліцейцы. Уся работа заняла паўгода, а кампазіцыя за кароткі час набыла папулярнасць у якасці фотазоны. Зручнасці надае і лаўка, на якую можна прысесці побач са шляхетнымі асобамі. Аналагічныя работы скульптара Аляксандра Анціпіна чакаюць гараджан на вуліцы Ажэшкі, каля спуску да Швейцарскай даліны. Кожны можа прысесці побач з бронзавай фігурай у старажытным адзенні, пацерці «на шчасце» бронзавы нос альбо руку. Мяркуючы па бляску, гэта робіцца рэгулярна.

Папулярная ў горадзе і фігура дзяўчыны-хвалі ў выкананні **гродзенскага скульптара Уладзіміра ПАНЦЯЛЕЕВА**. Яна ўстаноўлена падчас аднаго з юбілеяў горада на беразе рачулкі Гараднічанкі. Гэта самая рамантычная фігура горада, якая таксама з'яўляецца арт-аб'ектам для фотасесій.

Тут, у парку, у поўны рост наведвальнікаў сустракае бронзавы старажытны гараджанін, вельмі падобны на французскага батаніка Жана Жылібера, які заклаў у Гродне батанічны сад. Сёння гэты парк названы імем яго заснавальніка. Дарэчы, у горадзе няма скульптур, якія выканаў Уладзімір Панцялееў. Сам ён у ліку цікавых называе скульптуру святога Губерта, які не так даўно ўстаноўлены ў самым цэнтры горада. З аленем гэтага святога звязана легенда заснавання горада — ён упрыгожвае герб горада. Дарэчы, раней на месцы бронзавага Губерта стаяў драўляны турыст, але гараджане палічылі фігуру не вельмі эстэтычнай, да таго ж гэта быў плагіят з расійскай скульптуры, і яе прыбралі.



— Наш гарадскі ландшафт патрабуе значна большага ў плане арт-аб'ектаў, — лічыць Уладзімір Панцялееў. — Таго, што зроблена, мала. Мала цікавых рэчаў. Гараджанам і турыстам хочацца бачыць больш нейкіх бытавых, жанравых кампазіцый, карцінак з натуры.

Скульптар прыводзіць прыклад Віцебска, дзе, па яго словах, існавала цэлая праграма па ўстаноўцы такіх арт-аб'ектаў. Многія прадпрыемствы горада ў падарунак ставілі скульптуры.

У Гродне многае зроблена ў рамках праграмы «Спадчына». Цяпер яе замяніла «Культура Беларусі». Адкрыццё некаторых арт-аб'ектаў прымеркавана да знакавых гарадскіх падзей. Напрыклад, разглядаецца магчымасць устаноўкі памятнага знака ў гонар Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур. Згодна з эскізам, гэта сімвал фестывалю — кветка з бронзавым контурам, дзе кожны пялёстак з рознакаляровага шкла.

— Людзям цікава бачыць нешта новае ў горадзе, — заўважае скульптар. — Адна справа — стаяць каля будынка, і зусім іншая — каля нейкай унікальнай ці жартоўнай інсталяцыі. Я сам заўсёды шукаю менавіта такія аб'екты, каб зрабіць фота на памяць.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

II ГУЛЬНІ КРАІН СНД БЕЛАРУСЬ 2023

# «ГАЛОЎНЫ ІНДЫКАТАР — Чым запомняцца

**Абаяльны Рысік развітаўся і адправіўся дадому ў Белавежскую пушчу, усе медалі знайшлі сваіх герояў, арганізатары выдыхнулі — II Гульні краін СНД сталі гісторыяй, незабыўнай, непаўторнай гісторыяй. Заўсёды сумна развітвацца. Але як прыемна захоўваць ва ўласнай памяці яркія моманты, у памяці тэлефона — вясёлыя фотаздымкі, як карысна мець самае каштоўнае — вопыт.**

II Гульні краін СНД сталі экзаменам для ўсёй краіны, упершыню спартыўны форум праходзіў ва ўсіх рэгіёнах. Жлобін закахаўся ў самба, Гомель паказаў гарачыню на татамі, Магілёў — вытрыманую прыгажосць стральбы з лука, а затым здзівіў энергіяй каратэ. Брэст пацвердзіў званне гандбольнай сталіцы і горада, дзе ўсё атрымліваецца ў плыўцоў. Гродна працягнуў чэмпіёнскія традыцыі ў цяжкай атлетыцы і заклаў новыя ў хакеі на траве. Віцебскі летні амфітэатр упершыню прымаў не канцэрт, а спаборніцтвы па тайландскім боксе, у Оршы панавалі баксёры. Горад сонца — Маладзечна — прыняў турнір па самым летнім відзе спорту — пляжным валейболе. У горадзе моцным духам людзей — Салігорску — выступалі моцныя целам барцы. Мінск стаў сталіцай лёгкай атлетыкі, мастацкай гімнастыкі, валейбола, баскетбола, пляжнага футбола, міні-футбола, сучаснага пяціборства. Свята адчула ўся краіна. «У Гомелі прайшлі спаборніцтвы па дзюдо — запоўнены трыбуны. У Гродне на спаборніцтвах па цяжкай атлетыцы таксама запоўнены трыбуны. У Оршы спаборніцтвы па боксе — яблыку няма дзе ўпасці. У Мінску ідзе звычайны матч па валейболе, гуляюць жаночыя і мужчынскія зборныя Беларусі і Арменіі — поўнасцю запоўненыя трыбуны. Спаборніцтвы праводзіліся для людзей, і самы галоўны індыкатар — увага гледачоў», — адзначаў **міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК.** Ідэя правядзення спартыўнага форуму ў розных месцах асабліва спадабалася гасцям, якія змаглі пазнаёміцца з некалькімі гарадамі. Ацанілі яе і прадстаўнікі Азербайджана, якія ў 2025 годзе будуць прымаць III Гульні краін СНД. Намеснік міністра спорту Мар'яна Васільева адзначала, што ідэя з рознымі гарадамі атрымае працяг і ў 2025 годзе.




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Галоўнае дзейства разгортвалася, безумоўна, унутры спартыўных арэн. Але і побач з імі было чым заняцца і на што паглядзець. У кожным без выключэння горадзе дзейнічалі фан-зоны. Фантазія арганізатараў не ведала меж. А самае галоўнае — у месцах правядзення мерапрыемстваў было бяспечна. Як паведамілі ў Міністэрстве ўнутраных спраў, правапарушэнняў, злачынстваў і надзвычайных сітуацый у час правядзення II Гульняў краін СНД не дапушчана. Грамадскі парадак і бяспеку забяспечылі ў поўнай меры.

## Пастаўленыя задачы выканалі

Дэвіз Гульняў «Моцны характар — яркая гульня» стаў вызначальным для кожнага ўдзельніка спаборніцтваў. І гэта дало свае вынікі: у Беларусі 236 медалёў, з іх 48 залатых, 78 сярэбраных і 110 бронзавых. У медальным заліку наша краіна саступіла толькі Расіі, спартсмены якой сабралі 288 медалёў. А галоўнымі ўзнагародамі для ўсіх аматараў сталі незабыўныя моманты спаборніцтваў. Хіба можна забыць, як беларускія гандбалісты ў апошнія імгненні фінальнага матча вырвалі перамогу ў сапернікаў з Расіі і перамаглі з розніцай у адзін бал — 38:37.

Нагоду для радасці дала зборная па пляжным футболе. Нарэшце беларускія футбалісты сталі чэмпіёнамі! «Фантастыку» ў гульнявых відах спорту паказалі беларускія баскетбалісты, якія ў турніры 3х3 заваявалі чатыры медалі. Спякотнымі атрымаліся спаборніцтвы па пляжным валейболе, якія прынеслі «бронзу» мужчынскаму дуэту і «серабро» жаночаму. Медалі беларускім спартсменам прынеслі і спаборніцтвы па класічным валейболе: мужчынская юніёрская зборная стала сярэбраным прызёрам, а жаночая — чэмпіёнам II Гульняў краін СНД. Хакей на траве быў прадстаўлены ў новым фармаце — 5х5, які для многіх спартсменаў можа быць нязвыклым. Але беларусы не разгубіліся — і мужчынскія, і жаночыя каманды сталі чэмпіёнамі. У гульнявых відах спорту беларусы засталіся без узнагарод толькі ў спаборніцтвах па міні-футболе — занялі чацвёртае месца. Але спорт ёсць спорт. Гульнявыя віды спорту ў Беларусі перамогамі на буйных міжнародных стартах не распешчаныя. Таму II Гульні краін СНД прынеслі не толькі жаданыя медалі, але і веру ў тое, што ў гульнявых відах расце моцная моладзь.

# УСЁ ПА АЛІМПІЙСКІМ ПРЫНЦЫПЕ: ПЕРАМОГ НАЙМАЦНЕЙШЫ

## Значэнне II Гульняў краін СНД для баскетбола 3х3

**«У гульнявых відах спорту гэта проста фантастыка», — старшыня Беларускай федэрацыі баскетбола Максім РЫЖАНКОЎ не хаваў эмоцый ад турніру па баскетболе 3х3 у рамках II Гульняў краін СНД. Спаборніцтвы пад купалам сталічнай «Палова-арэны» сталі сапраўдным баскетбольным святам і падарылі ўсім мора незабыўных эмоцый, а таксама сталі важным крокам у развіцці баскетбола 3х3.**

Першымі медалі разыгралі дзяўчаты. У фінальным паядынку сустрэліся каманды Беларусі і Расіі. Гаспадыні пляцоўкі з пачатку сустрэчы захапілі лідарства, але паступова расіянкі скарацілі адставанне і за хвіліну да заканчэння матча вырвалі перамогу. На табло лічбы — 10:12. У расійскіх баскетбалістак — залатыя медалі, у беларускіх — сярэбраныя. Сярэбранымі прызёрамі сталі Алена Цітавец, Паліна Дамянюк, Аляксандра Палубок і Яўгенія Бярнацкая. Бронзавыя медалі жаночага турніру таксама засталіся ў Беларусі, іх заваявала каманда «Беларусь-2» у складзе Яны Макуцы, Паліны Катлінскай, Ксеніі Шэпель, Карыны Курстак. У матчы за трэцяе месца яны абыгралі сапернiц з Узбекістана — 22:6.

Баскетбольная барацьба закіпела ў мужчынскім фінале, дзе таксама сустрэліся каманды Беларусі і Расіі. Але тут беларусы адразу паказалі, хто гаспадар на пляцоўцы. З вынікам 19:12 чэмпіёнамі II Гульняў краін СНД сталі Іван Балдуеў, Данііл Каско, Ілья Мілашэўскі і Кірыл Васкаўцоў. У матчы за бронзавыя медалі другая беларуская дружына (Антон Гайдэль, Аляксей Юдкін, Арцём Брашко, Аляксей Шаўчэнка) перамагла баскетбалістаў Туркменістана з вынікам 22:13.

«Я вельмі шчаслівы за нашых спартсменаў — і за першую, і за другую каманды. Гэта значыць, што ў нас ёсць добры рэзерв і што не адна каманда можа дастойна выступаць на высокім узроўні. І дзяўчаты нашы добра сябе паказалі. Мы з расійскай камандай ужо не першы год спаборнічаем, і кожны раз яны паказваюць высокі клас гульні, таму не сорамна прайграць. А хлопцы ўвогуле малайцы: перамаглі Расію, яны проста зрабілі падарунак нашым балельшчыкам і гледачам», — падкрэсліў Максім Рыжанкоў. Па яго словах, на II Гульнях краін СНД усе адчувалі дамашнюю атмасферу нашай краіны.

Старшыня БФБ упэўнены, што турнір па баскетболе 3х3 прыцягне ўвагу дзяцей да гэтага віду спорту. Акрамя таго, баскетбол 3х3 выконвае добрую ролю стымулятара для заняткаў «вялікім» баскетболам. «Гэтыя два віды адрозніваюцца адзін ад аднаго і па правілах, і па сістэме судзейства, але ўсё роўна гэта баскетбол. І мы лічым баскетбол 3х3 адным са сваіх прыярытэтаў. Пачалі мы ім займацца значна раней за іншыя краіны. Як толькі ФІБА сказала, што гэты від спорту трэба рабіць алімпійскім, мы ўжо тады ўбачылі перспектыву і сталі яго развіваць, але як дадатковы від спорту. А сёння гэта паўнацэнная частка нашай баскетбольнай сям'і, якая жыве вельмі насычаным жыццём», — падкрэсліў Максім Рыжанкоў. Ён нагадаў, што ў беларускага баскетбола 3х3 поспехі больш значныя, чым у звычайнага. Напрыклад, у 2015 годзе жаночая юніёрская каманда 3х3 заняла другое месца першага чэмпіянату Еўропы сярод гульцоў да 18 гадоў. У 2019 годзе мужчынская і жаночая зборныя па баскетболе 3х3 сталі бронзавымі прызёрамі II Еўрапейскіх гульняў, якія таксама праходзілі ў Мінску. У 2021 годзе жаночая зборная па баскетболе 3х3 стала бронзавым прызёрам Кубка Еўропы U-17, а мужчынская зборная — бронзавым прызёрам Кубка Еўропы U-18. Абедзве беларускія каманды прывезлі дадому сярэбраныя медалі I Гульняў краін СНД.

Баскетбол 3х3 — не малодшы брат класічнага баскетбола, а самастойны і не менш захапляльны від спорту. У гэтым упэўнены і вядомыя беларускія баскетбалісты. **Намеснік старшыні Беларускай федэрацыі баскетбола, гулец знакамітага клуба РТІ Анатоль ЯКУБЕНКА** заўважыў, што ў баскетбол 3х3 павінны гуляць спартсмены, больш падрыхтаваныя фізічна і тэхнічна. «У гэтым відзе больш сутыкненняў, шмат падзенняў. Баскетбол 3х3 — траўманебяспечны від, таму што кароткі час на атаку і абарону, змены хуткія, арганізм павінен быць цалкам да гэтага гатовы. Я задаволены баскетбольным турнірам у рамках



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Гульняў краін СНД. Каманды паказалі сябе вельмі добра», — адзначыў Анатоль Якубенка.

**Алімпійская чэмпіёнка 1992-га года Ірына СУМНІКАВА** назвала турнір «бамбічным». «У кожнай гульні спартсмены аддаваліся поўнасцю. Для мяне здзіўленнем стала, як на такім высокім узроўні баскетбалісты трымаліся ўвесь турнір. Усё дакладна, усё прыгожа. Відаць было, што каманды сур'ёзна рыхтаваліся да гэтага старту. І хто лепш справіўся з нервовасцю і адказнасцю, той і пераможца. Усё па алімпійскім прынцыпе: перамог наймацнейшы. Усе каманды былі зараджаныя на перамогу, і гэта адчувалася. На напале барацьбы нібы міні-Алімпійскія гульні прайшлі. Мы даўно так не збіраліся, даўно такога свята не было. Дзякуючы Рэспубліцы Беларусь, дзякуючы Беларускай федэрацыі баскетбола, яно адбылося на самым высокім узроўні, свята адчувалася на трыбунах, што казаць пра спартсменаў. Мне аж самой захацелася выйсці на пляцоўку. Калі сама гуляеш, думаеш толькі аб гульні, на эмоцыі не зважаеш. Але калі сядзіш на трыбуне, адчуваеш сябе, нібы ўнутры бомбы запаволенага дзеяння», — дзялілася эмоцыямі чэмпіёнка.

Турнір па баскетболе 3х3 наведаў і легендарны баскетбаліст — **алімпійскі чэмпіён 1972 года Іван ЯДЭШКА.** Старшыня Беларускай федэрацыі баскетбола Максім Рыжанкоў уручыў чэмпіёну ганаровы знак БФБ «За заслугі». А Іван Іванавіч даў спартсменам каштоўную параду: «Звяртаючыся да моладзі, хачу сказаць: спорт дапаможа вам у жыцці, дапаможа стаць прафесіяналамі ў любой галіне. Вы хочаце быць першымі? Вы хочаце быць найлепшымі? У спорце здзяйсняюцца мары, а мара павінна быць адна — стаць прафесіяналамі ў абранай галіне»...

А II Гульні краін СНД сталі для іх удзельнікаў вялікім крокам да здзяйснення мары.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «УВАГА ГЛЕДАЧОЎ»

## II Гульні краін СНД

Традыцыйна радуе сваімі поспехамі айчынная лёгкая атлетыка. А на II Гульнях краін СНД яна пераўзышла ўсе чаканні. Па словах **дзяржаўнага трэнера па лёгкай атлетыцы Ігара СІВАДЗЕДАВА,** медалістамі II Гульняў краін СНД сталі 96 працэнтаў каманды. Беларускія спартсмены заваявалі 39 медалёў, з іх — 11 залатых. У Гродне, горадзе, дзе вырас двухразовы алімпійскі чэмпіён Аляксандр Курловіч, не перамагаць беларускія цяжкаатлеты проста не мелі права. Усяго ў беларусаў 22 медалі. На гродзенскі памост выйшла сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў Дар'я Наумава. Сапраўды фурор выклікала выступленне алімпійскага чэмпіёна 2008 года Андрэя Арамнава, які заняў трэцяе месца.

У кожнага віду адзінаборства свая прыгажосць і свая філасофія. У гэтым усе ўпэўніліся падчас II Гульняў краін СНД. «Відаць, што працуе федэрацыя, што моладзь ідзе ў барацьбу, ёсць канкурэнтнае асяроддзе. Атрымалася сапраўднае свята спорту. Мне тут радасна і камфортна», — дзяліўся сваімі ўражаннямі ад спаборніцтваў па барацьбе **алімпійскі чэмпіён Раман УЛАСАЎ.** У скарбонцы беларускай зборнай па спартыўнай барацьбе 21 медаль: 6 залатых, 7 сярэбраных, 8 бронзавых.

Беларускія дзюдаісты на II Гульнях краін СНД сабралі адзін сярэбраны і сем бронзавых медалёў. Таму, як падкрэслілі трэнеры, наперадзе ў іх шмат працы. І гэта вельмі важна, бо цяпер у нацыянальнай камандзе ідзе змена пакаленняў. «Шчыра кажучы, мы не чакалі, што дасягнём такога поспеху. Калі планавалі гэтае мерапрыемства, разлічвалі, што ў нас будзе дзесьці чатыры медалі. А па факце двух дзён бескампраміснай і яркай барацьбы мы атрымалі 11 медалёў — 4 сярэбраныя і 7 бронзавых», — падвёў вынікі спаборніцтваў па каратэ **старшыня Беларускай федэрацыі Аляксей БАГДАНАЎ.** І гэтым усё сказана. Спаборніцтвы па самба ў Жлобіне прывялі да таго, што мясцовыя ўлады задумаліся аб адкрыцці тут аддзялення па гэтым відзе. Самбісты ў горадзе металургаў выступілі на дзясятку — сабралі 10 медалёў (6 бронзавых, два сярэбраныя і два бронзавыя). Беларускія баксёры заваявалі два залатыя, сем сярэбраных і дванаццаць бронзавых. І, па словах **галоўнага трэнера маладзёжнай зборнай Алега КАРАКОВА,** гэта 150 працэнтаў з таго, што маглі. Чатыры залатыя медалі заваявалі беларусы і ў спаборніцтвах па тайскім боксе.

Зборная Беларусі па плаванні на II Гульнях краін СНД заваявала 32 медалі, у тым ліку адзін залаты, 11 сярэбраных і 20 бронзавых. Для таго каб зразумець значнасць гэтага поспеху, варта ўлічваць, што для спартсменаў гэта першы міжнародны старт. Не падвялі і пяціборцы, а дакладней пяціборкі: Марыя Гнедчык стала чэмпіёнкай II Гульняў краін СНД, Міра Бурая заняла другое месца ў індывідуальным турніры. А разам дзяўчаты сталі пераможцамі ў эстафеце. Сапраўдны фурор, як і заўсёды, выклікалі гімнасткі. Аліна Гарнасько, Арына Аверына, Лала Крамарэнка выступалі на дыване. А з трыбун за імі назіралі Аліна Кабаева, Святлана Хоркіна, Яўгенія Канаева і іншыя славутыя чэмпіёнкі.

Адстраляліся на «золата» і стралкі. У плане на II Гульні краін СНД былі заяўлены 17 медалёў, у тым ліку 8 асабістых. «План аказаўся выкананы на ўсе 100 працэнтаў: як ні дзіўна, менавіта такі расклад ад асноўнай каманды мы і атрымалі — 8 індывідуальных узнагарод і 17 у суме», — расказала **старшы трэнер нацыянальнай каманды Вікторыя ЧАЙКА.** Сярэбраныя медалі ў камандным турніры мужчын і жанчын, у спаборніцтвах змешаных пар ад беларускіх стралкоў з лука сталі найлепшым падарункам для старшыні Беларускай федэрацыі Мікалая Марусава. І для ўсіх аматараў.

II Гульні краін СНД вылучаліся сваім наватарскім падыходам да многіх рэчаў і пры гэтым захавалі адну традыцыю, уласцівую Беларусі, — форум прайшоў на высокім арганізацыйным узроўні, і пры гэтым сутнасць спорту — у пастаянным удасканаленні. На гэта звярнуў увагу і **міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК,** ацэньваючы перспектывы Гульняў краін СНД: «Гульні, якія два гады таму прайшлі ў Казані, былі пробныя. Беларусь узняла планку, і яна знаходзіцца на дастаткова высокім узроўні. У Азербайджане агульнымі намаганнямі, думаю, вывядзем Гульні на яшчэ больш высокі ўзровень. Гэта цікава і спартсменам, і гледачам, і нам, функцыянерам, якія арганізоўваюць такія мерапрыемствы».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «МЫ — МАЛАЙЦЫ, ПРАЯВІЛІ ХАРАКТАР»

## Валейбалісткам не да сціпласці

**Ярка, маляўніча, эмацыянальна было ў нядзелю на «Чыжоўка-Арэне». Тут разгарэўся фінал жаночых спаборніцтваў па валейболе. Забягаючы наперад, адзначым, што беларускія юніёркі атрымалі бліскучую перамогу.**

Першая партыя для нашай жаночай зборнай адкрыта не задалася. Расійскія валейбалісткі ўзялі верх з лікам 25:16. Аднак гэтая перамога так і засталася для іх адзінай і нядоўгай. Ужо ў другой партыі нашы прыгажуні сталі гуляць больш рашуча і ўпэўнена — мяч за мячом прылятаў на поле расіянак. Такім чынам, у другой партыі з лікам 25:18 выйграла каманда Беларусі. У трэцяй і чацвёртай партыях нашы спартсменкі не без цяжкасці перамаглі з лікам 25:13 і 25:20 адпаведна. Такім чынам, з лікам 3:1 беларуская зборная стала чэмпіёнкай II Гульняў краін СНД па валейболе, Расія здавольваецца «серабром», «бронзу» забрала каманда Казахстана.

«Гэта была вельмі яркая гульня, мы ўсе адчулі бясконцую колькасць эмоцый, — расказала **гулец беларускай зборнай па валейболе Ларыса ЯЗЭПАВА.** — Мы шчаслівыя, што выйгралі гэты турнір. Ён значны для нас, мы да яго вельмі доўга рыхтаваліся».

Нягледзячы на перамогу, спартсменка лічыць, што ім не ўдалося выкласціся на максімум, але вынік радуе. «У нас былі матчы з камандамі з розных краін. Мы ўсе вельмі стараліся. Зразумелая справа, што не ўсе гульні ўдалося правесці так, як мы хацелі, але апошняя паказала, што ўся наша работа была праведзена нездарма. Вядома, былі дзесьці і правалы, але я лічу, што ў цэлым мы выступілі ўдала».

«Не толькі задаволены, але і шчаслівы! — падзяліўся ўражаннямі з журналістамі **галоўны трэнер юніёрскай зборнай U-16 Генадзь АЛЕКСАНДРОВІЧ.** — На самай справе была праведзена вельмі вялікая работа, дзяўчаты цярпелі, стараліся. Я трэнер у жыцці добры, але часам магу папрасіць і строга. Расія згуляла вельмі прыстойна, практычна не памылялася, але мы малайцы, праявілі характар, пераламалі ход сустрэчы, прыйшлося сякія-такія тактычныя нарыхтоўкі зрабіць, але малайцы, што яны гэта выканалі. Я вельмі рады за дзяўчат».



У валейбалістак на трыбунах была вельмі моцная падтрымка. За матчам назіралі і перажывалі за дзяўчат прэзідэнт НАК Беларусі Віктар Лукашэнка, Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Луцкі, міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук, пасол Расіі ў Беларусі Барыс Грызлоў.

Не меней напружана было і на пляцоўцы сталічнага Палаца спорту. Там завяршыліся спаборніцтвы па валейболе сярод мужчынскіх юніёрскіх зборных у рамках II Гульняў краін СНД. Чэмпіён мужчынскага турніру вызначыўся ў сустрэчы каманд Беларусі і Расіі, якія раней атрымалі па чатыры перамогі, не прайграўшы пры гэтым ні сэта. Аднак у вырашальным матчы зборная Расіі была мацнейшай за каманду Беларусі, нягледзячы на тое, што ў кожным адрэзку нашы спартсмены навязвалі сур'ёзнае супраціўленне. Такім чынам, з лікам 3:0 (25:19 25:21, 25:19) чэмпіёнам II Гульняў краін СНД па валейболе стала каманда Расійскай Федэрацыі. Беларусь атрымала сярэбраныя медалі турніру.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фота БелТА.**

# ЧАМУ НАВУЧЫЛІ СПАБОРНІЦТВЫ ПА МІНІ-ФУТБОЛЕ

**Спорт — гэта не толькі перамогі, але і паражэнні. На жаль, на сабе гэта адчулі беларускія зборныя па міні-футболе. У фінале мужчынскіх каманд сустрэліся зборныя Беларусі і Расіі. У выніку жорсткай і напружанай гульні перамогу атрымала каманда Расійскай Федэрацыі з лікам 4:2.**



«Мы ўсе рады, што выйгралі турнір. Гэта была наша апошняя гульня, і мы вельмі чакалі гэтага! — распавёў **гулец зборнай Расіі па міні-футболе Уладзіслаў ШВЕЦАЎ.** — За тыдзень да турніру ўпарта трэніраваліся на базе, усе пасабравалі, атрымаўся добры калектыў. Гэта прынесла свой плён. Усе каманды вельмі моцныя, але мы крута згулялі, у нас усё атрымалася. Сённяшнія сапернікі вялікія малайцы, забілі два галы. І хоць мы іх ледзь-ледзь зацяснулі, але ўсё роўна яны біліся да канца».

Гульні краін СНД назаўжды застануцца ў памяці маладых спартсменаў. Для многіх з іх гэта першы міжнародны старт. «Для нашых хлопцаў гэта велізарны вопыт, які спатрэбіцца ва ўсім футбольным жыцці, — адзначыў **галоўны трэнер зборнай Расіі па міні-футболе Сяргей АБРАМАЎ.** — Вялікі дзякуй за гэты турнір, дзякуй хлопцам за тое, як яны рэагавалі ў розных матчах».

Галоўны трэнер падкрэсліў, што ў Беларусі іх сустрэлі выдатна, арганізацыя на найвышэйшым узроўні, а ў падрастаючых спарстменаў — добрая будучыня. Магчыма, спаборніцтвы для моладзі стануць праводзіцца часцей. «Мы абмяркоўвалі з калегамі з іншых краін магчымасць правядзення такіх матчаў часцей. Мы пастаянна на сувязі тут з усімі трэнерскімі штабамі, ужо ёсць пэўныя намёткі, можа, хтосьці да нас прыедзе, можа, мы кудысьці», — расказаў Сяргей Абрамаў.

«Лічу, што мы згулялі на добрым узроўні, проста дзесьці не забілі свае галы. У цэлым, добра выступілі, але крыўдна, вядома, за вынік. У другім тайме, магчыма, у нейкая псіхалогія згуляла, хацелі ўтрымаць лік», — расказаў **гулец беларускай зборнай па міні-футболе Данііл АСТАФ'ЕЎ.**

Данііл лічыць, што нашым спартсменам трэба больш працаваць над сваімі фізічнымі данымі. «Таксама вельмі вялікі перапынак паміж маладзёжнымі чэмпіянатамі — па пяць месяцаў. Многія сабраліся за два тыдні да турніру. З усіх каманд вельмі хацелі згуляць з Расіяй — у іх больш вопыту, моцная каманда. Гулялі з імі прыкладна на роўных, проста яны, магчыма, былі больш фізічна падрыхтаваныя, чым мы».

Таксама футбаліст адзначыў, што заўсёды прыемна гуляць пры запоўненых трыбунах. Ён удзячны балельшчыкам, якія прыходзілі на кожныя гульні, падтрымлівалі. Арганізацыя, па яго словах, на найвышэйшым узроўні.

«Усяго крыху не хапіла, каб перамагчы, — такім меркаваннем падзяліўся з журналістамі **галоўны трэнер зборнай Беларусі па міні-футболе Аляксандр ЧЭРНІК.** — Тры матчы былі блізкія да станоўчага выніку. У першым матчы, калі 1:1 згулялі з Узбекістанам, не хапіла рэалізацыі некаторых галявых момантаў. Калі прапускаеш адзін мяч, другі, — пачынаюць апускацца рукі, расчароўваешся. Хоць аналізавалі, глядзелі, з трэнерскім штабам рабілі разбор матча, рыхтуючыся да сённяшняй сустрэчы. На самай справе былі добрыя моманты забіць. Забівай, пераломвай — з гэтага і складаецца перамога. У сённяшнім матчы быццам і па ліку вялі, і ўсё па сілах было. Важна індывідуальна выканальніцкае майстэрства».

Пад канец турніру камандзе было складана выцягваць гульню. Аддадзена шмат сіл. «Але ўсё роўна ўдзячны хлопцам: прарабілі вялікую работу, усе біліся, стараліся. Псіхалогія, напэўна, паўплывала. Трэба выхоўваць асоб, лідараў з моцнай псіхалогіяй, футбалістаў з характарам», — адзначыў Аляксандр Чэрнік.

Ён падкрэсліў, што падтрымка балельшчыкаў, безумоўна, дапамагала. «Калі ты гуляеш пры поўных трыбунах, — гэта ж адрэналін, ногі самі цябе гоняць, адчуваеш неверагодныя эмоцыі. Хтосьці, зразумелая справа, першы раз гуляў пры такіх трыбунах. Вядома, ёсць і перадстартавы мандраж, але я кажу хлопцам: увязаліся ў бойку, выйшлі на поле — а там ужо лягчэй будзе».

Такім чынам, зборная Расіі-U19 па міні-футболе ўпэўнена перамагла на II Гульнях краін СНД. «Серабро» турніру заваявала зборная Кыргызстана, якая зарабіла 7 балаў. «Бронза» адпраўляецца ва Узбекістан: спартсмены гэтай краіны таксама набралі 7 ачкоў, але прайгралі кыргызскай камандзе ў вочнай сустрэчы. Беларускія футбалісты засталіся на 4-м радку з чатырма ачкамі, замкнула табліцу каманда Азербайджана, якая не набрала ніводнага бала.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фота БелТА.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by |
| **Продавец** | ОАО «Сбер Банк», 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 32А-1 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов:**

| | |
|---|---|
| **Лот № 1 – капитальное строение, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 19Б/5** | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
| **Магазин** (здание специализированное розничной торговли) общей площадью 1176,8 кв. м, инвентарный номер 500/С-22967 | **483 929,57** |
| **Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве общего долевого постоянного пользования (доля 131/625) для реконструкции существующих зданий и сооружений под торговые павильоны и строительство новых зданий, сооружений и торговых павильонов рынка по продаже строительных, электротехнических, сантехнических материалов и оборудования общей площадью 7,7471 га | |
| **Лот № 2 – Имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Пушкина, 172** | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
| **1. Здание банка** (здание нежилое) общей площадью 2124,2 кв. м, инвентарный номер 710/С-52251. Составные части и принадлежности: подвал. **Обременение: аренда.** **2. Помещение гаражей** (помещение транспортного назначения), общей площадью 41,6 кв. м, инв. номер 710/D-54201. **3. Складское помещение** (складское помещение), общей площадью 41,3 кв. м, инв. номер 710/D-54202. **4. Тепловая сеть** (сооружение специализированное энергетики), протяженностью 71,2 кв. м, инв. номер 710/С-73150, по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Пушкина, тепловая сеть по ул. Пушкина, ул. К. Либкнехта от ТК-1005/1 до ТК-1005 | **1 038 443,33** |

**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 741000000006001659:** предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания Первомайского отделения ОАО «Белпромстройбанк» в г. Бобруйске общей площадью 0,2969 га

**Дополнительная информация по лоту № 2:** при приобретении предмета аукциона победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона. Состав имущества и цены размещены на сайте организатора аукциона www.cpo.by и www.ipmtorgi.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028 500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** не более 30 дней со дня заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,5 %** от цены продажи лотов №№ 1, 2

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов по лотам №№ 1–2 опубликовано в газете «Звязда» от 12.07.2023 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | Начало торгов: **10.00 11.09.2023.** Окончание торгов: **12.00 11.09.2023.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **08.09.2023** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by

**Продавец:** ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты», ул. Даумана, 95, 222120, г. Борисов, Минская обл., +375 177-78-83-92

**Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by

**Предмет электронных торгов:**

| | |
|---|---|
| **Административное здание «Б»** (здание административно-хозяйственное), инв. номер 610/С-1407, общей площадью 5429,7 кв. м, по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Даумана, 107/1. Составные части и принадлежности: Б4/ск-Административное здание «Б», В1/к-Пристройка, (Б4/ск)-Подвальный этаж, б1-Проезды, б2-Пешеходные дорожки, б3-Подпорная стена. **В состав лота входят зеленые насаждения (9 ед.)** | **Начальная цена с НДС 20 %: 2 527 164,00 белорусских рублей** |

**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 620850100014000772:** предоставлен на праве аренды по 13.07.2039 г. общей площадью 0,4053 га для обслуживания административного здания «Б»

**Дополнительная информация: 1. Обременение – аренда. 2.** Победитель электронных торгов обязан за свой счет не позднее одного месяца с даты заключения договора купли-продажи предмета аукциона установить по всей границе земельного участка, разделяющей территории Продавца и Покупателя, со стороны Продавца непрозрачное, прочное, высотой не менее трех метров ограждение, оборудованное колючей проволокой «Егоза», если иное не согласовано сторонами

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки».** УНП 191 021 390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после электронных торгов. **Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона** |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победителем электронных торгов либо единственным участником электронных торгов, согласившимся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 0,2 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов. Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, также **оплачивает затраты продавца** на проведение оценки в сумме 1300,00 бел. руб. и затраты по публикации извещения в газете

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов:** 18.09.2023 г. с 10.00 по 12.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 15.09.2023 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Ельский лесхоз, Гомельская область, г. Ельск, Мозырский тракт, 6 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов: Погрузчик универсальный «Амкодор 352»,** р/зн. ЕВ-3 0645, 2008 г. в., № кузова Y3A352Л0080048, расположенный по адресу: Гомельская область, г. Ельск, Мозырский тракт, 6. **Начальная цена – 36 500,00 бел. руб. с НДС 20 %**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 30.08.2023.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **29.08.2023** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by) 15.08.2023 г.

**Контактные телефоны:** +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06. **E-mail:** auction@cpo.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
### на право заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (узкопалого рака)
### <u>15.09.2023 в 11.00</u>
### в здании Лидского райисполкома по адресу: г. Лида, ул. Советская, д. 8, кабинет 16,

состоится аукцион на право заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (узкопалого рака) сроком на 5 лет.

**<u>Предмет</u>:** право на заготовку и (или) закупку диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (узкопалого рака) на территории гидрологического заказника местного значения «Березина» в Лидском районе, которое не является предметом спора.

К участию в аукционе допускаются юридические лица и индивидуальные предприниматели или их представители по надлежаще оформленной доверенности, подавшие в комиссию необходимые документы.

Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться в комиссии и обменять билеты участников аукциона на порядковые номера, подлежащие возврату в комиссию после его окончания.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона в сумме фактических затрат осуществляются участником, выигравшим торги.

Согласно заключению ГНПО «НПЦ НАН Беларуси по биоресурсам» от 29.06.2023 № 250-01-02/1170 расчетная биомасса облавливаемой части популяции узкопалого рака в водных объектах заказника составляет 2,2 тонны. Предельно допустимый объем изъятия составляет 1,0 тонну.

**Начальная цена предмета торгов:** 740,00 бел. руб.

**Шаг аукциона (размер увеличения начальной цены объекта торгов):** 5 % от начальной цены.

**Размер задатка:** 148,00 бел. руб.

Задаток вносится на расчетный счет Лидского районного исполнительного комитета **BY16AKBB36042612800014200000 ОАО «АСБ «Беларусбанк», БИК банка AKBBBY2X, УНП 500826128.**

**Адрес и телефон комиссии:** г. Лида, ул. Советская, д. 8, каб. 17, тел. 8 (0154) 621420.

**Документы, которые необходимо представить участникам аукциона до их начала:**

заявление с указанием, на какой территории и какие виды диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, предполагается заготавливать и (или) закупать по результатам аукциона;

заверенная банком копия платежного поручения, подтверждающая внесение суммы задатка на расчетный счет Лидского райисполкома;

доверенность (для представителя) или иной документ, подтверждающий полномочия должностного лица;

копию свидетельства о государственной регистрации юридического лица или индивидуального предпринимателя.

**Прием заявлений** об участии в аукционе будет осуществляться по адресу: город Лида, улица Советская, дом 8, кабинет 17 <u>с **8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 до 12.09.2023.**</u>

В Лидском районе в р. Дитва ранее обитал широкопалый рак, который в настоящее время во многих местах замещен чужеродным видом – полосатым раком. В случае поимки широкопалого рака его необходимо незамедлительно выпустить назад в водоем и сообщить в ГНПО «НПЦ НАН Беларуси по биоресурсам».

## ШВАБСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (организатор аукциона)
## извещает о проведении 20 сентября 2023 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Ограничения в использовании, инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Расходы по изготовлению документации (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **д. Швабы, ул. Поселковая, д. 15,** 623287611101000158, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | 0,2500 | Черта населенного пункта Имеются сети: электрификации, подъездные пути, водоснабжение | 4500,00 | 900,00 | 282,88 + расходы за размещение объявления |
| 3 | **д. Чеботари, ул. Лесная, д. 4,** 623287605101000373, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | 0,2500 | Черта населенного пункта Имеются сети: электрификации, подъездные пути, водоснабжение | 3000,00 | 600,00 | 2596,90 + расходы за размещение объявления |

**Дата, время и место проведения аукциона** 20 сентября 2023 в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26, Швабский сельский исполнительный комитет, контактные телефоны: **8 (01774) 59 1 35, 59 2 35; (+37529) 1071617.**

**Прием документов, ознакомление с участком и документацией:** ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 (кроме субботы и воскресенья) по 14.09.2023 включительно.

**Для участия в аукционе необходимо:**

1) подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов;

2) представить квитанцию об уплате суммы задатка;

3) представить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;

заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Задаток перечисляется на р/с № BY21AKBB36006191611010000000, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК банка AKBBBY2X, г. Логойска. УНП 600537220, Швабский сельский исполнительный комитет, код платежа 4901.

**Условия:** аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

**Ориентировочная сумма затрат на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры» составляет:**

1) д. Чеботари, ул. Лесная, д. 4 составляет ориентировочно – 9818,20 бел. руб. (водоснабжение – 218,20, электроснабжение 9600,00 бел. руб.);

2) д. Швабы, ул. Поселковая, д. 15 составляет ориентировочно – 14 599,95 бел. руб. (электроснабжение – 9600,00 бел. руб., водоснабжение – 218,20 руб., транспортная инфраструктура – 4781,75 руб.).

# БЕЗ РОДНЫХ ХАТ

**Даволі часта бяру ў рукі гэтую кнігу і ўважліва перачытваю некаторыя матэрыялы. Каторы ўжо раз з 1987 года, як выданне ўбачыла свет. Гэта «Памяць» — гісторыка-дакументальная хроніка Бярозаўскага раёна. Не стаіць кніга сярод многіх соцень іншых у маёй асабістай бібліятэцы, а заўсёды, як гаворыцца, пад рукой — на століку побач з рабочым сталом. Патрэба ў ёй пастаянная, тым больш пры надзвычай складанай і адказнай маёй журналісцкай рабоце — перажытае і незабытае ў вайну вачыма вясковага падлетка.**

Некаторыя асабістыя ўспаміны нашай маці Галены Антонаўны, старшай сястры Марыі, мая асабістая гісторыя, а таксама старажылаў вёскі Пешкі праверана і пацверджаны афіцыйнымі дакументамі. Значыць, тое, пра што распавядаю ў сваіх нарысах, праўда. Інакш і быць не можа.

## У АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДЦЫ НЕ НАЗВАНЫ...

Гэты аповед хачу пачаць з афіцыйнага дакумента, прыводжу тэкст на рускай мове, так, як у названай кнізе «Памяць».

«Из оперативной сводки за 16 июля 1944 г. Западнее и юго-западнее города Слоним наши войска, продолжая наступления, овладели районным центром Брестской области Береза-Картузская, а также с боями заняли более 80 других населенных пунктов. Средних — крупные населенные пункты, Голобуды, Юшкевичи, Борки, Галены, Ровбицы, Мурава, Купичи, Староволя, Бортновичи, Селец, Кабаки, Сегневичи, Мошковичи и Железнодорожная станция Береза-Картузская».

Цяжкім болем адгукаюцца ў маёй памяці гэтыя строга афіцыйныя звесткі. Не праходзіць гэты боль усе пасляваенныя гады. Наадварот, абвастраецца. Сярод названых у аператыўнай зводцы населеных пунктаў няма нашых Пешак. Можа, яны далёка ад тых мясцін, якія 16 ліпеня 1944 года савецкія войскі вызвалілі ад гітлераўскіх акупантаў? Ды не, паміж нашымі Пешкамі і вёскай Боркі, якая названа ў зводцы, усяго нейкіх паўкіламетра. Гэтыя паселішчы перад вайной ўваходзілі нават у адзін сельсавет — Пешкаўскі. Вёскі-сёстры — так называлі мясцовыя жыхары Пешкі і Боркі. І вось табе — у такім важным афіцыйным дакуменце чамусьці не аказалася нашых Пешак. Хоць па колькасці двароў і жыхароў вёска пераўзыходзіла Боркі.

Рэальна ў ліпені 1944 года нашых Пешак як паселішча не існавала. Не стала іх на нашай беларускай зямлі, а значыць, і на ўсім белым свеце 25 красавіка 1944 года. Якраз у гэты дзень, на Радаўніцу, у час другой карнай аперацыі, гітлераўцы і іх памагатыя здраднікі спалілі другую палову вёскі. Тую, якая не сканала ў агні восенню 1943 года, у час першай карнай аперацыі гітлераўскіх душагубаў.

## ГАРЭЛА... І НЕ ЗГАРЭЛА

Пасля другой карнай аперацыі на самай крайняй сядзібе, што бліжэй да лесу, засталася адзіная хата. Абгарэлая, чорная, яна стаяла сіратліва, наводзячы жах і нуду. Вось такі напамін аб чалавечым жытле. Тую хату таксама карнікі падпалілі. Слабенькія языкі агню ледзьве краналі сырыя хатнія сцены. Гэта было на руку некальким мужчынам і хлопцам, якія хаваліся ад карнікаў у густых кустах. Як толькі немцы пакінулі гэтае месца, яны падбеглі да падпаленай хаты. Спяшаліся і нават не думалі пра небяспеку. Па дарозе наламалі ў кустах густых галін, імі і збівалі полымя, якое разыходзілася па сценах хаты.

У той жахлівы дзень мужчыны і хлопцы адстаялі хату, якую паволі ахопліваў агонь. Збілі галлём полымя, пэўна, набралі вады, каб пагасіць нават самыя маленькія вугольчыкі, што тлелі на сценах.



Ужо потым, калі з Баразоўскага краю, а значыць і з Пешак, Савецкая Армія зусім выгнала немцаў, у тую хату вярнуліся яе гаспадары. Прывялі яе ў парадак, старанна ачысцілі ад слядоў агню... І ўсё ж на сценах дзе-нідзе тыя сляды засталіся. Моцна ўеліся яны ў дрэва, і гаспадары вырашылі: «Хопіць, колькі ж можна скрэбсці гэтыя сцены. Ну, адразу кідаецца ў вочы, што хата гарэла. Але ж не згарэла зусім, выратавалі яе. Дзякуй Богу, што пакуль ёсць дзе жыць, а далей паглядзім...»

Я і цяпер памятаю: заўсёды, калі ішоў у тыя месцы ў лес ці гнаў пасвіць карову, абавязкова пазіраў на гэтую хату. Адчуваў сябе ніякавата, стараўся хутчэй адысці ад гэтай сядзібы, дзе такі страшны сведка жахлівага дня. Хата ж быццам не хацела мяне адпускаць, быццам настойліва патрабавала: глядзі, хлопчык, на мяне страшную, не забудзь, што тварылі ў тваёй роднай вёсцы душагубы-чужынцы. Я і не забыўся...

## ДЗЕ ЖЫЦЬ ПАГАРЭЛЬЦАМ?

У сваіх аповедах пра перажытае і незабытае пры нямецкай акупацыі я падрабязна ўспамінаю, што ўяўлялі сабой нашы Пешкі. Дзве карныя аперацыі гітлераўскіх злачынцаў — і вёска знішчана дашчэнту, шмат яе жыхароў загінула. І цяпер, як толькі ўспамінаю лета і восень 1944 года, бачу перад сабой папялішча на месцы пешкаўскіх хат і розных гаспадарчых пабудоў. Усё зарасло кустамі, дзікім пустазеллем, травой. Але, дзякуй Богу, цяпер спаленая вёска не пустая. На папялішчах корпаюцца людзі. Хто як можа рыхтуе сабе нейкае жытло, трэба паспець да наступлення халадоў, каб зноў не вяртацца на хутары, не прасіць прытулку на зіму. Ну хоць якое жытло — толькі б сваё.

Амаль усе пагарэльцы на сваіх сядзібах капаюць зямлянкі, уцяпляюць іх. Нехта ставіць маленькую хатку, абы на курыных лапах — але ж сваю, перакочваюць бярвенні, што не згарэлі, нарыхтаваныя яшчэ да вайны. Хтосьці з тонкіх дошак і нават жэрдак збірае прымітыўнае жытло, якое пешкаўцы называюць «халабудай». Хоць што-небудзь, каб восенню схавацца ад халодных дажджоў і злых вятроў. Потым будзе лягчэй: дзяржава бясплатна адпускае пагарэльцам дзялянкі ў лесе для нарыхтоўкі бярвенняў, каб хутчэй ставіць новыя хаты. Хто якія можа, каму якія па сіле.

Ох, і цяжкая, доўгая работа. Вясковыя мужыкі на распілоўцы тоўстых бярвенняў рвуць усе свае жылы, падаюць ад стомы: яны ж пастаянна паўгалодныя, у абед пасёрбаюць з чыгунка зваранага шчаўя ці лебяды. Ну, мо жонка яшчэ што-небудзь падрыхтуе, мо крыху зерня намалацілі з беднага жыта, што пасеялі і скасілі на сваім палетку. Ці два-тры мяхі бульбы ўрадзіла на пустых загонах. Больш-менш сур'ёзная ежа для мужыкоў, занятых на будаўніцтве жытла...

Але ўсё часцей і часцей стомленыя твары пешкаўцаў быццам святлелі ад добрага настрою. Ну, завершаны важны этап будаўніцтва жытла для сям'і — памаглі талакой. І песні больш вясёлыя спявала моладзь вечарамі, бо ведалі ўсе: хутка канец праклятай вайны...

*Без родных хат,*
*ды з горкай доляй*
*Жылі мы доўга ў вайну,*
*Але заўсёды ў няволі*
*Мы верылі ў сваю вясну.*

## НЯМЕЦКІ БУНКЕР

І наша сям'я пачала капаць зямлянку. Ды адбылося нечаканае. Аднойчы бацька неяк дабраўся ў Бярозу. Хутка ў Пешкі прыехаў вялізны аўтамабіль і прывёз нам трафейны нямецкі вагончык. Дужыя хлопцы сцягнулі яго на зямлю і па просьбе бацькі ўстанавілі на краі агарода, пад разгалістай грушай-дзічкай. Яна крыху прыкрывала гэтае наша жытло ад ветру. Вагончык мы называлі «нямецкім бункерам».

Усе пешкаўцы прыходзілі паглядзець на гэты бункер. Звонку ён быў даволі прывабны. Фанерныя шчыты роўныя, шчыльна падагнаныя адзін да другога, акуратна пафарбаваныя ў жоўты колер. «Прыгожы ў цябе домік, — гаварылі людзі нашаму бацьку. — І дзе ж ты яго дастаў?» — «Дзяржава дала, — звычайна адказваў тата. — Па справядлівасці: у мяне ж малыя — як ім зімаваць без жытла?! А сваю хату пабудую не хутка пры маіх хворых нагах».

У нашай сям'і чакалася папаўненне, і, хто ведае, ці вытрымалі б мы галодную і халодную зіму, калі б не гэты бункер. Цесна ў ім было — і ўявіць немагчыма. Уваход — толькі вузенькія дзверы, праз якія ледзь працісліся. І самае жахлівае — цемната ўнутры. Якое ж святло магло прабіцца праз малюсенькае акенца ў такім бункеры? Самае-самае мізэрнае. Больш ніводнага акна, толькі суцэльныя шчыты.

## ПЯЧНІК РЫЗЫКАВАЎ

Наш бацька Мікалай Цімафеевіч па сваёй натуры быў прадбачлівы. Прывучылі яго да гэтага нялёгкае жыццё, пастаянныя нягоды, нястача. Тым больш у вайну, калі ў любы момант, як гаварылі пешкаўцы, «усё можа пайсці прахам». І ён адразу пачаў рыхтаваць наш бункер да зімоўкі. Дамовіўся з мясцовым печніком, каб той склаў хоць якую-небудзь печ. Цэглы кавалкамі ў нас крыху было — вясной 1944-га прывезлі поўны воз з маёнтка Капітанава, які згарэў. Ды і на нашым папялішчы нешта навыграбалі...

Праблема, і даволі сур'ёзная, была ў іншым — як размясціць гэтую саму печ у бункеры. Тут жа няма тых надзейных сцен, як у вясковай хаце, пабудаванай з тоўстых драўляных брусоў. У бункеры сценкі з тонкіх шчытоў. І даху такога, як у вясковых хатах, у бункеры не было. Зверху тыя ж шчыты, яны адначасова былі як бы адным цэлым — і столь, і дах.

Цяпер не памятаю, як нашаму бацьку ўдалося дамовіцца з тым печніком наконт печы. І як рызыкнуў той майстар узяцца за такую складаную і адказную работу. Неабходна ж было так паставіць печ, каб яна і бункер абагравала і каб найменш цяпла выходзіла на вуліцу праз тонкія сцены-шчыты, а яшчэ комін вывесці, каб максімальна выключыць любую магчымую небяспеку... Безумоўна, той пячнік быў адмысловым майстрам, добрасумленным чалавекам. Думаю, складзеная ім печ у нашым бункеры дадала яму павагі і аўтарытэту ў наваколлі. Тады ж печнікі былі, як кажуць, нарасхват. А наш бацька хваліў яго на ўсе Пешкі, і заслужана.

Вось і цяпер пішу гэтыя радкі — і быццам заходжу ў той наш бункер. Адразу ў куток справа — печ. Невялікая, вельмі акуратна і рацыянальна пастаўленая. Усё, што трэба гаспадыні, тут ёсць, пад рукой, дэталёва прадуманы і схаваны кожны куточак. Комін з печы выведзены наверх з самага краю бункера. На печы ёсць і ляжанка, без якой немагчыма ўявіць вясковую хату. І хоць у нас не хата, а бункер, добры пячнік знайшоў для яе месца. Як жа дзякавалі мы яму, калі ў сцюдзёныя марозныя зімы грэліся на цёплай ляжанцы. Уздоўж сцяны каля печы бацька паставіў нары, бо ніякага ложка ў нас не было: усё згарэла ў час карных аперацый.

Бацька разумеў, ды і людзі нам гаварылі, што пры марозных і віхурных зімах такая печ усё наша жытло са шчытоў не абагрэе. Таму якраз пасярэдзіне бункера абсталявалі месца для печкі-буржуйкі. Дзе яе бацька дастаў, цяпер не памятаю. Жалезную трубу ад буржуйкі вывелі наверх праз дзірку, прабітую ў шчыце, — такі атрымаўся дымаход. Мы думалі, што зрабілі нават немагчымае, каб не замерзнуць узімку, ды не тое тут было.

Як толькі надышла сапраўдная зіма, для нас пачаліся цяжкія пакуты. «Ніколі не забуду, што здарылася з нашым бункерам, як толькі прыхапілі злыя маразы, — успамінала мая сястра Марыя. — Бункер прамярзаў, і мы не ведалі, што рабіць. Маразы прабіралі кожны сантыметр нашага жытла, лезлі ва ўсе шчыліны, нават самыя маленькія. Мы прачыналіся раніцай, а ў бункеры — дзікая халадэча, мы калоцімся, дрыжым, зубы ляскаюць. Глянем уверх, а там густы белы іней — у бункеры ж няма даху. Іней таксама на дзвярах, на сценах. Тое адно акенца ў бункеры поўнасцю замерзла, праз яго нічога і не ўбачыш, і святло не пранікае».

Мы, дзеці, прыкрыліся рознымі лахманамі, прытуліліся адзін да аднаго, ляжым на нарах і не варушымся. Печ за ноч астыла. Маці плача: трэба малым хутчэй падрыхтаваць нейкі сняданак, а вада ў вядры замерзла. Колькі такіх страшных ранкаў выпала на нашу долю зімой 1944—1945 гадоў...

**Міхаіл ШЫМАНСКІ,**
**лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь,**
**супрацоўнік «Звязды» з 1959 па 1970 год.**

# Новымі і старымі шляхамі краязнаўства

## Як маладыя вучоныя дапамагаюць зрабіць яго масавай з'явай



**Аляксандр БАРАНОЎСКІ — адзін з цікавых маладых гісторыкаў нашай краіны. Працуе ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук. Актыўна займаецца гістарычным краязнаўствам. Аўтар асобных манаграфій і многіх навуковых публікацый на старонках «Беларускага гістарычнага часопіса», «Беларускай думкі» і іншых перыядычных выданняў. Мы вырашылі пагутарыць з маладым вучоным пра яго стаўленне да краязнаўчай працы. І вось што пачулі ў адказ...**

***— Аляксандр, як бы вы вызначылі саму формулу, сам тэрмін «краязнаўства»? На ваш погляд, краязнаўства ў Беларусі чымсьці істотным адрозніваецца ад краязнаўства ў іншых краінах, напрыклад у Расіі?***

— Пачну з сумнага, але жарту (аўтарства называць не буду): краязнаўства — гэта падстава, каб не спіцца вясковаму настаўніку. Калі сур'ёзна, то, на мой погляд, няма адзінага азначэння тэрміна. Мне бліжэй наступны. Краязнаўства — форма грамадскай дзейнасці, накіраваная на ўсебаковае вывучэнне пэўнага рэгіёна, яго гісторыі, культуры, мастацтва, эканамічнага развіцця, насельніцтва і прыроды. Думаю, што на постсавецкай прасторы адрозненні нязначныя. У Расійскай Федэрацыі краязнаўчы рух больш структураваны, там працэсей знайсці спонсара, які дапамажа з выданнем кніг. Але гэта ўжо пытанне традыцый. Ды і, магчыма, такое назіранне толькі вонкавае...

***— З чаго пачаўся ваш персанальны краязнаўчы вопыт?***

— Усё пачалося з артыкула «Прывід забытай мінуўшчыны» ў раённай газеце. Нават і сёння памятаю назву гэтай літаратурнай замалёўкі. Яе аўтар абураўся тым, што сядзібны дом, у якім жыў у 1903—1904 гг. легендарны паэт Айчыны Янка Купала, амаль разбураны і нікому не патрэбны. Зачапілі два моманты. Па-першае, народны пясняр Беларусі жыў і працаваў на Сенненшчыне. Па-другое, чаму разбураны сядзібны дом. Назапашаны матэрыял аформіў у якасці даследчай працы, з ёй атрымаў дыплом за першае месца ў занальным туры абласной краязнаўчай алімпіяды. У далейшым даследчая праца лягла ў аснову першай маёй кнігі «Полымя (Беліца): гісторыя маёнтка і вёскі», якую выдаў, ужо будучы студэнтам 4-га курса гістфака Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава.

***— Увогуле, калі гаварыць пра настаўніцтва ў краязнаўстве, наколькі істотнай падаецца вам яго роля ў развіцці зацікаўленасці да краязнаўства, па даследаванні Айчыны?***

— Лічу, настаўніцтва вельмі запатрабавана. Пры адказе абапіраюся на ўласны досвед. Мне пашанцавала, бо на першым курсе ў мяне выкладаў выдатны краязнаўца, кандыдат гістарычных навук Мікалай Півавар. Яго кандыдацкая дысертацыя нават прысвечана тэме, на якую гаворым, — «Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 1961—1991 гг.». З такім выкладчыкам нельга было не захапіцца прадметам і не працягваць уласнае даследаванне роднай Сенненшчыны. Мікалай Васілевіч нам заўсёды казаў, што кожны студэнт можа напісаць і выдаць працу. Дзякуючы яго рэкамендацыям і кіраўніцтву Дзяніса Юрчака, майго ўніверсітэцкага навуковага бацькі, і ўбачыла свет першая кніга.

***— Вы — прадстаўнік Віцебшчыны, родам з Сянно... Гэтая акалічнасць уплывае на вашы гісторыка-краязнаўчыя зацікаўленні?***

— Віцебшчына перш за ўсё! Мяне, як краязнаўцу, цікавіць родны Сенненскі край. Сфера ж навуковых інтарэсаў палягае ў даследаванні месца і ролі Віцебскай губерні ў дзяржаўна-тэрытарыяльным уладкаванні Савецкай Беларусі ў 1919—1924 гг. Разумею, што нельга замыкацца на адным рэгіёне ці мікрарэгіёне. Аднак гісторыя Беларусі складаецца з лакальных гісторый, у тым ліку і Віцебшчыны. Як прыклад, даследаванне старонак жыцця Аляксея Казака на Сенненшчыне прывяло мяне на агульнарэспубліканскі ўзровень, было ўстаноўлена, што гэты чалавек пэўны час узначальваў Цэнтральнае бюро краязнаўства.

***— Якія тэмы вам асабіста падаюцца меней распрацаванымі ў беларускім краязнаўстве, патрабуюць большай увагі?***

— Гісторыю ствараюць людзі — гэта аксіёма. Лічу, што ўсё роўна не хапае лакальных (па раёнах) біяграфічных даведнікаў, прысвечаных вядомым ураджэнцам і людзям, якія звязалі свой лёс з пэўнай мясцовасцю. Таксама вельмі актуальным і перспектыўным з'яўляецца стварэнне на мікраўзроўні краязнаўчых атласаў і карт славутасцяў. Менавіта падчас іх падрыхтоўкі павінен раскрыцца патэнцыял краязнаўцаў-аматараў. Іх стварэнне не патрабуе значных высілкаў. Галоўнае — фіксацыя і папулярызацыя славутасцяў.

***— Дарэчы, якія рэгіёны падаюцца вам найбольшымі цэнтрамі краязнаўчай працы? Ад чаго, ад якіх намаганняў гэта залежыць?***

— За ўсю Беларусь не магу адказаць. Паколькі з'яўляюся прадстаўніком Віцебшчыны, пра свой рэгіён і скажу. Сёння абласным цэнтрам паўночнага рэгіёна краіны па праве з'яўляецца Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна. Асобна, напэўна, вылучыў бы Лепельшчыну. У астатнім у асноўным усё трымаецца на адным чалавеку. Віцебскі раён — Мікалай Півавар, Мёрскі — Вітольд Ермалёнак, Пастаўскі — Ігар Пракаповіч, Чашніцкі — Віктар Грыбко і г. д. Што крыўдна, гэта ўсё людзі немаладыя.

Цэнтры фарміруюцца вакол апантаных справай, таму ўсё залежыць ад чалавечага фактару. Сапраўдны цэнтр склаўся, калі ёсць трохкутнік: краязнаўцы — мясцовыя органы ўлады — навукоўцы. Калі гэтага няма, тады атрымліваецца прыблізна так: «краязнаўца вельмі паважаны чалавек, але ў іншым горадзе!», «яны ж дылетанты» — і краязнаўца ў выніку застаецца сам-насам.

***— Усё ж такі ці патрабуе краязнаўства пэўных арганізацыйных высілкаў, метадычнай падрыхтоўкі?***

— Лічу, што на сённяшні момант стварэнне нейкай адзінай краязнаўчай арганізацыі не з'яўляецца актуальным. Краязнаўчы рух развіваецца без адміністрацыйнага цэнтра. Галоўнае — не перашкаджаць. А калі казаць пра метадычны і навуковы цэнтр, то такімі цэнтрамі з'яўляюцца Аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, абласныя бібліятэкі, музеі і ўніверсітэты. Інстытут гісторыі НАН Беларусі заўсёды гатовы падказваць, даваць парады краязнаўцам, што мы і робім падчас сваіх шматлікіх рэгіянальных канферэнцый, падчас падрыхтоўкі зборнікаў артыкулаў у рамках серыі кніг «Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі» і калі да нас проста звяртаюцца.

***— Ці дастатковай вам падаецца медыйная ўвага да краязнаўства? Ці патрэбен беларускім краязнаўцам свой масавы часопіс?***

— Я не сказаў бы, што краязнаўцы абдзелены медыйнай увагай. Усё ж такі мэтавая аўдыторыя краязнаўцаў — іх рэгіён ці мікрарэгіён, і тут адзіным сродкам масавай інфармацыі выступае раённая газета. «Раёнкі» недзе з 1980-х гг. не толькі друкуюць краязнаўцаў, але і самі штатныя супрацоўнікі пішуць краязнаўчыя тэксты. Вядома ж, усё залежыць ад чалавечага фактару. Напрыклад, у 2018—2019 гг. мы разам з галоўным рэдактарам «раёнкі» «Голас Сенненшчыны» рабілі краязнаўчы летапіс раёна «Двукоссе» (на гербе Сянно — выява дзвюх кос). «Двукоссе» выходзіла на дзвюх старонках раз на месяц. Назапашаны аўтарскі партфель (я запрашаў калег з Мінска, Віцебска, Лёзна і інш.) стаў асновай для ўдзельнікаў навукова-практычнай канферэнцыі «Сенненскі край: гісторыка-культурная спадчына рэгіёна», якая адбылася 1—2 ліпеня 2022 г. у Сянно і была арганізавана Інстытутам гісторыі НАН Беларусі і Сенненскім райвыканкамам.

Наконт краязнаўчага часопіса — лічу, што такое выданне вельмі патрэбна. Але яно павінна стаць сапраўды масавым, а для гэтага трэба літаральна дайсці да кожнага краязнаўца. Выданне часопіса вырашыла б шэраг пытанняў. Па-першае, спрыяла б выкараненню дылетанцтва ў даследаваннях. Па-другое, аказвала б метадычную дапамогу краязнаўцам, як у свой час гэта рабіў часопіс «Наш край». Пэўныя інструкцыі трэба актуалізаваць і перавыдаць, іншыя трэба распрацоўваць, як, напрыклад, выкарыстанне інтэрнэт-крыніц. Па-трэцяе, часопіс — годная пляцоўка для публікацыі матэрыялаў краязнаўцаў. У склад рэдкалегіі павінны ўвайсці гісторыкі, археолагі, архівісты, філолагі, супрацоўнікі музеяў і бібліятэк і, зразумела, краязнаўцы. Такому часопісу трэба заваёўваць свайго чытача. «Наш край» у свой час рэалізоўваўся бясплатна, а калі стаў па-сапраўднаму масавым, то перайшоў на падпіску.

***— Ці правільна гаварыць, што асноўнымі пляцоўкамі ў развіцці краязнаўчай работы сёння з'яўляюцца бібліятэкі краіны?***

— Так, дарэчы, на ўсіх узроўнях: сельскія, раённыя, абласныя. Пра кожную трэба сказаць асобна. Сельскія бібліятэкі, акрамя таго што збіраюць краязнаўчы матэрыял, захоўваюць розныя гістарычныя артэфакты. І гэта невыпадкова, паколькі ў наваколлі няма музеяў, мясцовыя жыхары нясуць усё менавіта ў бібліятэку. Трапляюць у сельскія бібліятэкі і дакументы калгасаў пасля іх ліквідацыі. Я сам неаднаразова знаёміў з летапісамі ліквідаваных калгасаў.

У раённых бібліятэках краязнаўчая праца, зразумела, на больш высокім узроўні. Яны ладзяць прэзентацыі кніг, сустрэчы з гісторыкамі і краязнаўцамі. Супрацоўнікі бібліятэк ствараюць краязнаўчую бібліяграфію, збіраюць і сістэматызуюць краязнаўчы матэрыял. Гэта значная дапамога для краязнаўцаў.

Абласным бібліятэкам уласціва ўсё вышэйадзначанае, толькі на больш высокім узроўні. І тут мне хацелася б сказаць некалькі слоў адносна працы Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна. Яна з'яўляецца флагманам краязнаўчага руху на Віцебшчыне. Бібліятэка ўдзяляе вялікую ўвагу стварэнню электронных краязнаўчых рэсурсаў. Сярод іх — «Художники Витебска», «Афганистан. Без права на забвенье», «Человек года Витебщины», «Вызваленне Віцебшчыны. 1943—1944». Асобна трэба спыніцца на камбінаванай базе даных «Прыдзвінскі край: гісторыя і сучаснасць». Гэта сапраўдная электронная энцыклапедыя, якая распавядае пра гісторыю, эканамічнае развіццё і культурнае жыццё 21 раёна Віцебскай вобласці.

Трэба адзначыць, што бібліятэка стымулюе краязнаўцаў вобласці на новыя адкрыцці, паколькі штогод на працягу амаль дзесяці гадоў на базе ўстановы ладзяцца навукова-практычныя канферэнцыі. Падчас іх краязнаўцы-аматары і навукоўцы абмяркоўваюць актуальныя пытанні гісторыі Віцебшчыны. Дзякуючы гэтым навуковым форумам дылетанцтва становіцца ўсё менш. Артыкулы, што прайшлі апрабацыю на канферэнцыі, публікуюцца ў сапраўды «брэндавым» зборніку бібліятэкі «Віцебскі край». Падсумоўваючы вышэйзгаданае, трэба падкрэсліць значную ролю бібліятэк краіны ў краязнаўчым руху Беларусі.

***— Наколькі шмат у развіцці краязнаўства на тым ці іншым гістарычным адрэзку залежыць ад школы, увогуле ад айчыннай сістэмы адукацыі?***

— Школа — гэта наша ўсё. Менавіта там чалавек пачынае далучацца да гістарычнага мінулага свайго краю і краіны ў цэлым. Пры гэтым вельмі важная асоба настаўніка. Прывяду два прыклады. Выдатны сенненскі краязнаўца Кірыл Анікіевіч вучыўся ў Сенненскім павятовым двухкласным вучылішчы, дзе пэўны час працаваў настаўнікам і Еўдакім Раманаў. Менавіта ён заахвоціў свайго вучня на даследаванне родных мясцін. Асноўная праца Анікіевіча «Сенненскі павет Магілёўскай губерні» — настольная кніга для краязнаўцаў Сенненскага, Бешанковіцкага, Крупскага, Талачынскага, Чашніцкага раёнаў. У маім жыцці таксама быў такі чалавек — першая настаўніца гісторыі Святлана Яроменка. Яна падтрымлівала мае гістарычныя пошукі. Пад яе кіраўніцтвам была падрыхтавана першая даследчая праца.

Калі пэўны час настаўнічаў сам, таксама натхняў вучняў на вывучэнне нашай Сенненшчыны: мы ўдзельнічалі ў краязнаўчых канферэнцыях, здымалі фільмы пра родныя мясціны, наведвалі знакавыя месцы горада, рабілі папяровыя макеты страчаных архітэктурных помнікаў.

Пра ранейшы час мне казаць складана, але сёння айчыннай сістэмай адукацыі створаны спрыяльныя ўмовы для развіцця краязнаўства. Працуе Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства. Праводзіліся турысцка-краязнаўчыя экспедыцыі «Наш край», «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся» і інш.

Актыўна развіваецца ўніверсітэцкі краязнаўчы рух. Удзельнікі школьных гурткоў працягваюць развівацца ў агульнаўніверсітэцкіх краязнаўчых гуртках. Падчас маёй вучобы ў ВДУ імя П. М. Машэрава такім асяродкам быў клуб «Краязнавец».

***— Краязнаўства, краязнаўчая работа і гістарычная навука... У чым тут павінны праяўляцца супольнасць, паяднанасць? Ці патрэбны дысертацыйныя даследаванні, звязаныя і з гісторыяй краязнаўства і з яго арганізацыяй на сучасным этапе?***

— Лічу, што гісторыкі і краязнаўцы ўзаемазалежныя. Краязнаўцы — гэта, па сутнасці,

дарэвалюцыйныя карэспандэнты гісторыкаў. Яны дапамагаюць у выяўленні новых помнікаў, правядзенні археалагічных раскопак, звяртаюць увагу на тыя ці іншыя факты з гістарычнага мінулага свайго краю, папулярызуюць працы гісторыкаў. У сваю чаргу, гісторыкі даюць метадычныя парады краязнаўцам, выступаюць у якасці рэцэнзентаў іх прац, перадаюць ім найбольш цікавыя дакументы пра іх рэгіён. Зразумела, усё вышэйадзначанае ў ідэале. Бывае і такое, што краязнаўцы не ідуць на кантакт з гісторыкамі, а гісторыкі лічаць краязнаўцаў дылетантамі. У краязнаўцаў і гісторыкаў адна мэта — вывучэнне нашай Бацькаўшчыны. Для гісторыка гэта прафесія, для краязнаўца — стан душы.

На сёння ў Беларусі абаронены тры кандыдацкія дысертацыі па гісторыі беларускага краязнаўства ў савецкі час. Ёсць некалькі кандыдацкіх дысертацый па галінах краязнаўства. Усё гэта сведчыць пра высокі ўзровень айчыннага краязнаўства, бо менавіта краязнаўчы рух з'яўляецца прадметам дысертацыйных даследаванняў. На сучасным этапе вельмі запатрабаваны дысертацыйныя даследаванні. Нават тэму прапаную — «Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 1992—2022 гг.». Гэты трыццацігадовы перыяд зусім не падобны да іншых: з'яўленне інтэрнэту, велізарная колькасць краязнаўчых форумаў, падрыхтоўка і выданне кніг «Памяць» у новым фармаце і інш.

***— У гісторыі беларускага краязнаўства апошніх дзесяцігоддзяў добра вядомыя імёны Генадзя Каханоўскага, Віталя Скалабана, ды шмат каго яшчэ... Якім бы чынам вы прапанавалі ўшанаваць для наступных пакаленняў памяць пра іх?***

— Краязнаўцы — людзі вельмі апантаныя. Увесь свой вольны час яны прысвячаюць любімай справе. За асабістыя сродкі набываюць гістарычныя артэфакты, выдаюць кнігі. Таму ў першую чаргу я прапаную выдаваць зборнікі прац выдатных краязнаўцаў, куды пад адной вокладкай павінны ўвайсці газетныя артыкулы, матэрыялы канферэнцый, асобныя працы. Лічу вельмі правільным арганізацыю і правядзенне імянных краязнаўчых і навукова-практычных канферэнцый. Дарэчы, у лістападзе 2023 г. на базе Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь адбудуцца ІІ Скалабанаўскія чытанні.

***— Ведаю, што вы настойліва займаецеся падрыхтоўкай навукова-практычнай канферэнцыі да 100-годдзя Цэнтральнага бюро краязнаўства. Раскажыце пра гэта падрабязней.***

— У 2024 г. мы будзем адзначаць 100-годдзе арганізаванага краязнаўства. У сувязі з гэтым Інстытутам гісторыі НАН Беларусі запланавана маштабная навукова-практычная канферэнцыя «Гістарычнае краязнаўства Беларусі: вопыт, праблемы і перспектывы развіцця». Пры дапамозе органаў мясцовай улады плануем запрасіць па адным прадстаўніку з кожнага раёна, з гарадоў — не цэнтраў раёнаў, з абласных гарадоў. Запланавана работа сямі панэляў. На кожнай будуць выступаць некалькі экспертаў. Ідэя панэлі — наладзіць жывыя зносіны паміж спецыялістамі і краязнаўцамі. Краязнаўцы атрымаюць метадычныя парады ад экспертаў. Адбудуцца і звычайныя секцыйныя пасяджэнні, дзе абмяркуюць актуальныя пытанні краязнаўства Беларусі. Пакуль усе задумкі раскрываць не будзем.

**Гутарыў Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

Родзічы

# СЯДЗІБА З ГІСТОРЫЯЙ

## Пляменнік Аркадзя Куляшова Віталь МАСЛОЎСКІ пра бацькоўскую хату знакамітага паэта і любоў да другой малой радзімы

**Вядома, што Аркадзь Куляшоў нарадзіўся ў вёсцы Саматэвічы Касцюковіцкага раёна, але другой яго радзімай, якая аб'яднала ўсю куляшоўскую сям'ю, стаў менавіта Хоцімск, вось гэты сціплы жоўтага колеру будынак, дзе жылі бацькі Аркадзя Аляксандравіча і куды ён наведваўся ўсялякі раз, калі прыязджаў на радзіму. Дом надзейна хаваецца ад цікаўных вачэй у зялёным гушчары, адразу яго нават не прыкмеціш. Але пераблытаць яго ні з якім іншым немагчыма. На сцяне вісіць памятная дошка з выявай Аркадзя Куляшова і яго вершаванымі радкамі.**



Віталь МАСЛОЎСКІ ганарыцца сваімі продкамі.

### У ГАСЦЯХ

Прызнаюся, не спадзявалася сустрэць тут каго-небудзь з радні Куляшова. Ведала, што ёсць пляменнік паэта Віталь Іванавіч Маслоўскі, які жыве ў Мінску. Але так супала, што ён якраз прыехаў у Хоцімск адпачыць разам са сваёй жонкай Наталляй Мікалаеўнай. Клімат тут гаючы. Шмат зелені, цішыні...

Адчыніла брамку і паклікала гаспадароў. Ніхто не адгукнуўся. Зайшла ў дом і застыла на парозе. Такое ўражанне, што перанеслася як мінімум на 60 гадоў назад. Мэбля савецкіх часоў, сціплыя шпалеры, фіранкі на вокнах, беленая печка. І вельмі шмат святла. А дзе ж людзі?

Гаспадары хутка знайшліся, а калі даведаліся, што да іх завітаў прадстаўнік адной са старэйшых і паважаных газет краіны, узрадаваліся. Віталь Маслоўскі адразу ж прапанаваў перайсці на родную мову. Маўляў, на ёй зручней успамінаць пра жыццё вядомага беларускага паэта.

На сцяне — вялікая колькасць сямейных фатаграфій. У цэнтры — зусім яшчэ маладыя бацька і маці Аркадзя Куляшова. Жанчына — рэдкая прыгажуня, ёсць у ёй нешта арыстакратычнае.

— Кацярына Фамінічна Ратабыльская са праўды з дваранскага роду, — удакладняе пляменнік. — Яе дзед служыў у арміі і ўдзельнічаў у турэцкай вайне. Пасля таго як вярнуўся, атрымаў дваранскае званне. Прозвішча паходзіць ад словазлучэння «быць на радзе». На жаль, фота самога Фамы Кузьміча Залесец-Ратабыльскага не захавалася, але бабуля вельмі на яго падобная.

Кацярына Ратабыльская пазіруе разам са сваім першынцам — Аркадзем. Гэта адно з першых фота будучага паэта. Ён стаіць апрануты ў доўгую кашулю. У пісьменніка Алеся Бадака ёсць кніга, дзе ён піша пра жанчын, дзеці якіх сталі знакамітымі. І гэты партрэт ён размясціў якраз на вокладцы сваёй кнігі. Пераводжу вочы на здымак побач. На ім партрэт Аляксандра Мікалаевіча Куляшова. Ён таксама прыгажун, з гарачым адкрытым позіркам. Нядзіўна, што маладая настаўніца, якая прыехала пасля паспяховага заканчэння царкоўна-прыходскай школы працаваць у вёску Стараселле, закахалася ў калегу.

— Бабуля родам з Крычаўскага раёна, дзядуля — з Мсціслаўскага, а ў Касцюковіцкім яны стварылі сям'ю і ў ёй нарадзіўся Аркадзь, — расказвае Віталь Іванавіч. — Паэма «Далёка да акіяну» пра дзеда. На гэты твор, дарэчы, паэта натхніў Аляксандр Твардоўскі. Там усё пра дзяцінства, юнацтва, пра бацькоў. Кацярына Ратабыльская была з вялікай сям'і, дзе выхоўвалася шмат дзяцей. Яе маці рана памерла, бацька болей не ажаніўся, усіх дзяцей падняў на ногі сам. Бабуля расказвала, што, калі папрасіла благаслаўленне на шлюб, ён сказаў: «Бог таксама любіў, вось і вы любіце адзін аднаго — такое маё благаслаўленне».

### ВАЕННАЕ ЛІХАЛЕЦЦЕ

Першая маёмасць у Хоцімску ў Куляшовых з'явілася яшчэ да вайны.

— Дзед купіў хату ў 1935 годзе, — расказвае Віталь Іванавіч. — У вайну яна згарэла, як і шмат іншых на вуліцы Камсамольскай. Каб было дзе жыць, пабудавалі невялічкую хатку, як бабуля яе называла — будачку. Яна была ў глыбіні саду, мне маці паказвала тое месца. І ў кнізе «Памяць» Хоцімскага раёна пра гэта напісана. Будачкай называлася, таму што была маленькая па памерах, хоць і з печкай. Аркадзь Куляшоў расказаў, што сваю паэму «Новае рэчышча», за якую ў 1948-м атрымаў Сталінскую прэмію другой ступені, ён пісаў у той будачцы.

Ваенны перыяд у жыццёвай біяграфіі бацькоў Куляшова самы складаны і супярэчлівы.

— Усё, што было звязана з дзедам, абрасло легендамі, чуткамі, але Аляксандр Мікалаевіч Куляшоў застаўся варты свайго звання настаўніка, — кажа суразмоўнік. — Ён быў біёлаг, працаваў шмат у якіх школах, займаўся медыцынскай справай. Бабуля расказвала, што падчас вайны, калі немцы стварылі сваю адміністрацыю, яны хацелі зрабіць дзеда старастам. Маўляў, чалавек вядомы, аўтарытэтны, да таго ж нямецкую мову ведае. Але бабуля хутка выправіла яго да сясцёр пад Крычаў. Успамінала, што потым дзеда з сынам Валодзем немцы адправілі ў Германію. Назад яны вярнуліся толькі пасля вайны.

### СЯМЕЙНЫ ЛЕТАПІСЕЦ

Так у сям'і звалі Валянціну, дачку Аркадзя Куляшова. Прыгажуня, разумніца, яна скончыла Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт. На сямейным фота, што вісіць на сцяне хоцімскай хаты, яна ўжо з першынцам Валодзем. Побач бацькі, яе браты Уладзімір і Аляксандр, хатняя работніца Ірына.

— Аксана Фёдараўна — жонка Аркадзя Куляшова — пражыла доўгае жыццё, яе не стала ў 2005-м, калі ёй было 96 гадоў, — расказвае Васіль Іванавіч. — Пайшлі з жыцця Аляксандр і Валянціна, з сям'і Аркадзя Куляшова застаўся толькі Валодзя, які нарадзіўся ў 1938 годзе. Ён маладзейшы за Валянціну на два гады. На жаль, апошнім часам нашы сувязі з ім абарваліся. Калі была жывая Валянціна, яна ўсіх нас неяк аб'ядноўвала.

Валянціна была асноўным летапісцам сям'і, паспела шмат што ў бацькі спытаць. Ужо пасля яго смерці склала альбом, прысвечаны яго жыццю і творчасці. Яна ж — аўтар кнігі «Лясному рэху праўду раскажу», якая выйшла ў серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі».

— Там і пра Аляксандра Мікалаевіча Куляшова цікава напісана, — удакладняе Віталь Маслоўскі. — Некаторыя артыкулы пра сям'ю яна друкавала ў часопісе «Роднае слова». Шмат чаго расказала бабуля — пра сваю маладосць, пра калгасы. Яна была вельмі мудрая жанчына. Дзякуючы ёй, лічы, сям'я і захавалася, нягледзячы на ўсе перыпетыі.

### ПРЭМІЮ ЎКЛАЎ У БУДАЎНІЦТВА

Дом у Хоцімску быў пабудаваны пасля вайны, за грошы Дзяржпрэміі, якую Аркадзь Куляшоў атрымаў у 1946 годзе за паэму «Сцяг брыгады». Віталь Іванавіч успамінае, як яны жылі тут, калі ішла будоўля. Было не вельмі зручна, але якія ўсе былі шчаслівыя! Жылі прадчуваннем светлай будучыні. Дом атрымаўся прасторны, утульны, светлы — аж на дзевяць вокнаў. Грувасткай мэблі тут ніколі не было, усё досыць сціпла. І ад гэтага тут нават лягчэй дыхаць. Нашчадкі традыцыі не змянялі. У доме практычна ўсё так і засталося, як пры жыцці паэта. Нават аўра тая ж.

— Закончылі будаўніцтва і падпісалі дакументы на хату ў 1947 годзе, — успамінае суразмоўнік. — Аркадзь прыязджаў сюды часта, калі ехаў на сваю малую радзіму ў Саматэвічы. Потым вяртаўся да бацькоў у Хоцімск. Машына ў яго была «Перамога» і асабісты вадзіцель — франтавік Ілья Мікалаевіч Арцемік, у свой час, здаецца, вазіў Янку Купалу. Калі ездзілі мыць машыну, нас, дзяцей, набівалася ў салон колькі магло ўлезці. Адлегласць 300 метраў, але ж праехаць на такой машыне было крута. Наогул, калі дзядзька Аркадзь прыязджаў, пачыналася свята для ўсіх. У дзяцінстве ў яго было захапленне лавіць ракаў. Ён быў майстар іх прыгатаваць. Калі мы падраслі, рыхтаваліся да яго прыезду загадзя, лавілі ракаў, а калі знянацку прыязджаў, хадзілі на рынак і куплялі адразу вядро. Варылі па-свойму, шмат крапівы кідалі, каб пах адбіць. І ўмелі пасаліць. Потым усе садзіліся вакол стала і выварочвалі ракаў проста на стол. Самае смачнае ў ракаў — так званая шыйка. Аркадзь Аляксандравіч сядзеў і з задавальненнем высмоктваў яе.

Асабіста мне запомнілася, як ён прыязджаў на пачатку лета і спяшаўся ў лес слухаць зязюлю. Яе можна было б пачуць і тут, але ён ехаў у Варвараўскі лес. Ён недалёка, па дарозе на Расію ў бок Суража. Пазней, калі з падрос і ўсё стала на філалагічныя рэйкі, я зразумеў, чаму ён так рабіў. *«Згадай усё, што сэрцу міла, / Што сэрцу дорага было, / Забудзь, што ўсё адгаманіла, / Адкукавала, адышло. ...»* Гэта было тое, што ён перажыў.



### ДОМІК З ВОКНАМІ Ў САД

Віталь Маслоўскі вырас у гэтым доме, але нават і не меркаваў, што будзе яго ўладальнікам.

— Калі дзеда не стала, хата была запісана на бабулю, — расказвае Віталь Іванавіч. — Аркадзь Аляксандравіч меў свае планы на гэты дом, але хутка таксама пайшоў з жыцця. Дзед памёр у 1977 годзе 1 лістапада, а праз некалькі месяцаў «забраў» і Аркадзя. Бабуля вырашыла перадаць спадчыну сваёй дачцэ Надзеі — маёй маці. Праўда, запісваць на яе хату не стала, а падарыла мне. Я тут нарадзіўся і кожнае лета сюды прыязджаю. У мяне ў пасляваенным Хоцімску было шмат сяброў. У 50-м пайшоў у школу, памятаю, як мы тут жылі пасля вайны, як усё будавалася. Калі хата мне дасталася, мы ўсё рабілі для таго, каб і яна, і сад былі дагледжаныя. Хацелі зрабіць тут нешта мемарыяльнае.

Тут яшчэ цётка жыла, сястра Аркадзя Куляшова — Антаніна Аляксандраўна, цяпер ёй 93 гады. Працавала ў школе-інтэрнаце. Закончыла Магілёўскае педвучылішча, Аркадзь ёй дапамагаў вучыцца. Сёння яна ў Забялышыне ў доме састарэлых. У 92 гады яшчэ сама забіхалася, а цяпер засталася там. Калі была жывая маці Аркадзя Куляшова, да яе студэнты прыязджалі, дапамагалі як шэфы. Але сувязь ужо даўно перарвалася.

Напаследак Віталь Маслоўскі запрашае мяне ў цяністы сад, пасаджаны рукамі яго дзеда. Яблыні і ў цяперашні час шчодра кормяць сваіх гаспадароў. А яшчэ тут знаходзіцца дзедаў калодзеж. Суразмоўнік кажа, што ніякая іншая вада не ідзе ў параўнанне з гэтай. Празрыстая, як сляза, і вельмі смачная.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

*г. п. Хоцімск.*

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Буда-Кошелевский КБО»** (УНН 400035136), 247355, Гомельская обл., г. Буда-Кошелево, ул. Головачева, 10. Тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **30 августа 2023 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

Предмет торгов –

### ИМУЩЕСТВЕННЫЙ КОМПЛЕКС:

1. Изолированное помещение с инв. № 321/D-5300 общей площадью 28,1 кв. м, наименование: изолированное помещение № 10, назначение: помещение бытового обслуживания населения, расположенное по адресу: Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Головачёва П.Я., 10-10; 2. Изолированное помещение с инв. № 321/D-5301 общей площадью 84,2 кв. м, наименование: изолированное помещение № 11, назначение: помещение бытового обслуживания населения, расположенное по адресу: Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Головачёва П.Я., 10-11; 3. Изолированное помещение с инв. № 321/D-5302 общей площадью 71,3 кв. м, наименование: изолированное помещение № 12, назначение: помещение бытового обслуживания населения, расположенное по адресу: Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Головачёва П.Я., 10-12; 4. Изолированное помещение с инв. № 321/D-5300 общей площадью 403,5 кв. м, наименование: изолированное помещение № 13, назначение: помещение бытового обслуживания населения, расположенное по адресу: Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Головачёва П.Я., 10-13; 5. Забор металлический с калиткой, инв. № б/н; 6. Водопровод, инв. № б/н; 7. Тепловая сеть, инв. № б/н; 8. Оборудование: 8.1. Сушуар, инв. № 509; 8.2. Сушуар, инв. № 581; 8.3. Рабочее место приемщика, инв. № 550; 8.4. Рабочее место приемщика, инв. № 501; 8.5. рабочее место приемщика, инв. № б/н; 8.6. Рабочее место приемщика, инв. № б/н; 8.7. Комплект оборудования рабочего места обувщика, инв. № б/н; 8.8. Кресло с гидроподъемником, инв. № 00369 (нераб.); 8.9. Комплект оборудования для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, инв. № 502; 8.10. Комплект оборудования для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, инв. № б/н; 8.11. Стеллаж торговый, инв. № б/н (5 шт.); 8.12. Оборудование для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, инв. № б/н (2 шт.); 8.13. Петельная машина 25 кл. Minerva 19724, инв. № 00018; 8.14. Сейф металлический, инв. № б/н (5 шт.); 8.15. Стиральная машина автомат «Атлант», инв. № 00360 (нераб.); 8.16. Стиральная машина автомат «Атлант», инв. № 00361 (нераб.); 8.17. Стиральная машина автомат «Атлант», инв. № 00363 (нераб.); 8.18. Стиральная машина автомат «Атлант», инв. № 00364 (нераб.); 8.19. Швейная машина 22 кл. инв. № 849 (м/лом); 8.20. Швейная машина 22 кл., инв. № 837 (м/лом); 8.21. Швейная машина 22 кл., инв. № 517 (м/лом). Кадастровый номер земельного участка, на котором расположены объекты недвижимости – 320550100001000723 (7/10 доли в праве аренды).

Обременение по изолированным помещениям – договоры аренды помещений, крыши; по зданию – договор электроснабжения.

Начальная цена предмета торгов – 191 144,00 бел. руб. с НДС.

Телефон для ознакомления и осмотра +375 29 135-78-72.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 16.08.2023 г. 09.00 по 29.08.2023 г. 16.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 21.07.2023 г.

## СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Призы с Onliner Клевер»

1. Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.
2. Сроки проведения рекламной игры: с 03.07.2023 по 04.09.2023 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения рекламной игры).
3. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4329 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 14.06.2023.
4. Количество участников рекламной игры – 2033 чел.
5. Информация о призовом фонде:

Размер призового фонда рекламной игры составляет 13 927 (тринадцать тысяч девятьсот двадцать семь) белорусских рублей 87 (восемьдесят семь) копеек. Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

6. Информация о победителях рекламной игры:

| № п/п | Фамилия, инициалы победителя | Сведения о выигрыше |
|---|---|---|
| 1 | **Луцкий С.А.** | Приз (тур № 1) – смартфон Apple iPhone 14 128GB/MR3X3 (желтый), денежные средства в размере 439,77 бел. руб. |
| 2 | **Ровбуть А.А.** | Приз (тур № 2) – смартфон Apple iPhone 14 128GB/MR3X3 (желтый), денежные средства в размере 439,77 бел. руб. |
| 3 | **Чаусов С.А.** | Приз (тур № 3) – смартфон Apple iPhone 14 128GB/MR3X3 (желтый), денежные средства в размере 439,77 бел. руб. |
| 4 | **Ларионов А.А.** | Приз (тур № 4) – смартфон Apple iPhone 14 128GB (желтый), денежные средства в размере 491,31 бел. руб. |

7. Для получения приза победители должны явиться не позднее 04.09.2023 (включительно) по адресу: г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, предварительно связавшись с Организатором рекламной игры по номеру многоканального телефона +375 (29) 514 35 24.

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Лоевский КБО»** (УНН 400028996) 247095, Гомельская обл., г. п. Лоев, ул. Ленина, 24а, тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **30 августа 2023 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Кресло парикмахера (инв. № 2305), 2006 г. в.; сушуар BS-007 (инв. № 2318), 2008 г. в. | 1,50 |
| 2 | Форма метал.кольца КС-10,9 (инв. №№ 2552, 2553, 2554), 2013 г. в. (3 ед., некомплект) | 6,60 |
| 3 | Изолированное помещение инв. № 340/D-2118475 общ. пл. 63,3 кв. м, наименование: изолированное помещение № 2, назначение: торговое помещение на земельном участке с кадастровым № 323081205601000101 (61/100 доли в праве постоянного пользования) по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, Колпенский с/с, ул. Советская, 23А-2 | 3300,00 |

**Местонахождение – г. Гомель, ул. Б. Хмельницкого, 77.**
**Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 16.08.2023 г. 09.00 по 29.08.2023 г. 16.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 календарных дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 21.07.2023 г.

Утерянный аттестат временного (антикризисного) управляющего № 1048 на имя ЖУРОВА Сергея Вячеславовича **считать недействительным.**

## ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ООО «Вестерн хорс»

(УНП 193425364, Минская область, Логойский район, с/с Острошицкий, д. Чуденичи, д. 2, пом. 4 (административное)).

***Дата и время проведения торгов:*** **25 августа 2023 года.**

Начало – 10.00. Заявки принимаются с 15 августа 2023 года по 24 августа 2023 года.

***Место проведения торгов:*** Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:*** **ООО «Вестерн хорс» (УНП 193425364**) в лице ликвидатора – директора ООО «Юридическое агентство «КлеверКонсалт» А.А. Колыско.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте http://www.specrealization.by. Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах: РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 125 (30005) за 01.07.2023.

## Аукцион 29.08.2023 по реализации имущества ОАО «Оршанский комбинат строительных материалов»

| | |
|---|---|
| Сведения об организаторе торгов (операторе ЭТП) | **ООО «Госторги»: 210027, г. Витебск, пр-т Строителей, 6, а/я 77, e-mail: info@auction24.by, тел.: +375 (29) 8-185-185, +375 (33) 3-155-185** |
| Продавец | **ОАО «Оршанский комбинат строительных материалов» (211038, Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Копысь, ул. Октябрьская, 80; УНП 300073637), тел. +375 (29) 295-35-41** |
| Форма, дата, время и место проведения торгов | 1) Четвёртые повторные электронные торги в форме аукциона с повышением начальной цены (в отношении лотов с № 1 по № 5) будут проводиться **29 августа 2023 года (вторник).** 2) Вторые повторные электронные торги в форме аукциона с повышением начальной цены (в отношении лотов с № 6 по № 9) будут проводиться **29 августа 2023 года (вторник). Торги проводятся на электронной торговой площадке «Аукцион 24», расположенной по адресу: https://auction24.by, и длятся один день с 09.00 до 16.00** |
| Сведения о предмете торгов, начальная (минимальная) цена | Всего сформировано 9 (девять) неделимых лотов. Начальные и минимальные цены указаны без учета НДС. **Продавец освобожден от уплаты НДС на основании п. 2.30.2 ст. 115 Налогового кодекса Республики Беларусь** |

| № лота | Наименование | Начальная цена лота, рублей | Минимальная цена, руб. | Размер задатка 10 %, руб. | Шаг торгов 5 %, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Комплекс из 17 зданий и сооружений (имущества) производственной базы общей площадью 866,7 кв. м, расположенных по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36 на 17 земельных участках с кадастровыми № 223656200001000209 площадью 4,0806 га, предоставленном на праве постоянного пользования, №223656200001000210 площадью 0,2906 га, №№ 223685090501000020-223685090501000035 площадью 0,0001 га каждый и прочее имущество, включенное в неделимый лот (согласно списку). Всего в лот включено 80 наименований имущества. Подробная информация о составе имущества в лоте ранее размещалась в газетах «Звязда» (за 28.04.2023, 06.06.2023, 28.06.2023, 15.07.2023) и «Витебские вести» (за 27.04.2023, 06.06.2023, 27.06.2023, 14.07.2023, 18.07.2023); на электронной торговой площадке (ЭТП «Аукцион 24») на сайте https://auction24.by и в Едином государственном реестре сведений о банкротстве на сайте https://bankrot.gov.by | 338 872,00 | 338 872,00 | 33 887,20 | 16 944,00 |
| 2 | Комплект из 4 станков для обработки дисковых пил Reform и Vollmer и прочего имущества, расположенный по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36 | 114 528,00 | 114 528,00 | 11 452,80 | 5 727,00 |
| 3 | Комплект из 2 станков для обработки ленточных пил и прочего имущества, расположенный по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36 | 15 396,00 | 15 396,00 | 1 539,60 | 770,00 |
| 4 | Капитальное строение с инв. № 240/С-129758, наименование – склад сортированного круглого леса площадью 1861,6 кв. м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, склад сортированного круглого леса | 29 090,00 | 29 090,00 | 2 909,00 | 1 455,00 |
| 5 | Установка для штабелирования досок (Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36 | 50 598,00 | 50 598,00 | 5 059,80 | 2 530,00 |
